ПЕР. КОРОЛЕНКО 18
БИБ-КЕ КОРОЛЕНКО
1.12 38

Пролетары ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 228 (6204) | 2 кастрычніка 1938 г., нядзеля | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва прадпрыемстваў БССР.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ:

З. К. Бейненсон. — Як мы працуем з парторгамі.

П. В. Блудчы. — Выхоўваць беспартыйныя масы.

А. Г. Буднік. — Наша совецкая інтэлігенцыя.

М. І. Мазалеўскі. — Перадавыя трактарысты ўступаюць у рады партыі Леніна—Сталіна.

А. Вялюгін, З. Ларысаў. — Баявы прадстаўнік партыі.

АРТЫКУЛЫ:

В. Чарнышоў. — Дзве атакі. (Эпізоды гераічных баёў ля возера Хасан).

Клава Граншчыкава. — Мацуйце абарону радзімы.

А. С. Гарнастаеў. — Паскорыць увядзенне правільных севазваротаў.

І. Васількоў. — Там, дзе выраблююць цвікі.

І. Ветраў. — Вопыт ільназавода Сіманава.

ЗА РУБЯЖОМ:

Пасяджэнне Палітбюро ЦК французскай комуністычнай партыі.

Закрыццё Сесіі Совета Лігі нацый.

Выступленне тав. М. М. Літвінава.

Пагадненне чатырох дзяржаў у Мюнхене.

Паведамленне агенцтва Рэйтэр.

Чэхаславацкі ўрад прыняў рашэнне мюнхенскай канферэнцыі.

Эвакуацыя з раёнаў Паўднёвай Чэхіі.

Польскі ультыматум Чэхаславакіі.

Чэхаславацкі ўрад прыняў польскі ультыматум.

Чэмберлен абяцаў Гітлеру калоніі.

Паведамленне ТАСС.

Дэманстрацыя ў Празе.

Выступленне Сыровы.

Пасяджэнне французскага ўрада.

У лізе нацый.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі.

ВЫКАНАЦЬ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЛАН ЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ ЛЕСУ

Лясная прамысловасць — загатоўка і вывазка лесу — важнейшая галіна народнай гаспадаркі краіны. Не гледзячы на велізарную дапамогу, якую аказвае лясной прамысловасці Беларусі партыя і ўрад, яна ўсё яшчэ працуе нездавальняюча. Перыяд летніх загатовак і вывазак лясная прамысловасць рэспублікі заканчвае з ганебным вынікам. На 25 верасня гадавы план загатоўкі драўніны выканан Наркамлесам на 65.5 процанта. На гэты-ж дзень вывезен 71 процант загатоўленага лесу.

Асабліва паказальны лічбы выканання плана вывазкі за III квартал лесапрамтрэстамі. На 20 верасня менскі леспрамтрэст выканаў план вывазкі ўсяго толькі на 13.2 проц., магілёўскі — на 9,2, Мазырскі леспром — на 6,5 процанта.

Прычыны адставання лясной прамысловасці не раз ускрываліся. З дастатковай яснасцю яны былі паказаны на Першай сесіі Вярхоўнага Совета БССР у канцы ліпеня гэтага года ў выступленні дэпутата тав Маркіна. Дрэнная арганізацыя працы ў лесе, на вывазцы, на складах, недапушчальна дрэннае выкарыстоўванне аўтатрактарнага парка, адсутнасць дапамогі стаханаўцам, слабая работа сярэдняга звяна— ляснога майстра, адсутнасць канкрэтнага аператыўна-тэхнічнага кіраўніцтва з боку як Наркамлеса, так і новаарганізаваных леспрамтрэстаў, а таксама леспрамгасаў і начальнікаў мехпунктаў, слабая пастаноўка масава-палітычнай работы сярод рабочых — такія прычыны дрэннай работы лясной прамысловасці, на якія ўказала Сесія Вярхоўнага Совета. Гэтыя прычыны не знішчаны і на сёння.

Возьмем такое рашаючае пытанне для вывазкі, як выкарыстанне аўтатрактарнага парка. За 8 месяцаў 1938 года механізмамі трэба было вывезці 1.690 тыс. кубаметраў драўніны. Фактычна-ж вывезена толькі 692,9 тысячы кубаметраў — 41 процант. [illegible] 70 процантаў аўтамашын па розных прычынах сістэматычна стаялі Такое-ж становішча з выкарыстоўваннем трактароў.

Касцюковіцкі мехпункт (начальнік т. Паташенка) мае дзесяць газагенератараў, працуе толькі пяць. Але і на гэтых пяці работа вельмі дрэнна арганізавана. Замест 40 кубаметраў машыны ва дзве змены вывозяць ледзь 20 кубаметраў. За перадапошнюю пяцідзёнку вывезена ўсяго 500 кубаметраў.

Але вось другі прыклад з работы Іванаўскага механізаванага лесапункта Чэрвеньскага раёна (начальнік Лучнік). Тут работа праводзілася на 7 машынах. Вывезена за пяцідзёнку 2.400 кубаметраў драўніны. Сакрэт вельмі просты — работа была арганізавана ў тры змены. Нельга сказаць, каб на Іванаўскім мехпункце справы абсталі вельмі добра. План у цэлым ён таксама не выконвае Але вось у некаторых адносінах была праяўлена ініцыятыва і яна дала добрыя рэзультаты. Зразумела, нічога, роўна нічога, апрача ўласнай бездапаможнасці не перашкаджала кіраўнікам Асіпавіцкага, Чачэрскага і многіх іншых мехпунктаў прарабіць тое-ж самае.

Лясная прамысловасць уступае зараз у адказнейшы перыяд асенне-зімовых загатовак і вывазкі. Згодна вызначанага плана, у чацвертым квартале павінна быць загатоўлена 750 тысяч кубаметраў драўніны і столькі-ж вывезена. У першым рашаючым квартале 1939 года павінна быць загатоўлена два мільёны кубаметраў і вывезена 2.200 тысяч кубаметраў.

Гэты план не з'яўляецца напружаным. Але ён у той-жа час не лёгкі. Усё будзе залежаць ад арганізацыі справы, ад перабудовы работы ўсёй сістэмы Наркамлеса і кожнага лесаўчастка ў паасобку.

Несумненна, галоўныя звенні, якія рашаюць выкананне плана, гэта—прывядзенне ў вытворчую годнасць усіх механізмаў, рамонт абсталявання, трас, складаў, гаражоў, стварэнне ў адпаведнасці з планамі пастаянных кадраў рабочай сілы, поўнае выкананне плана ў прыцягненні калгаснікаў для загатовак і вывазкі лесу, падрыхтоўка жылля і неабходнага паспельнага і бытавога інвентара А галоўнае — разгортванне стаханаўскага руху, соцыялістычнага спаборніцтва. Іменна за гэтыя звенні трэба ў першую чаргу ўзяцца кіраўнікам лясной прамысловасці.

Можна без перапавелічэння сказаць, што адной з буйнейшых бед лясной прамысловасці, яе кіраўнікоў з'яўляецца забыццё стаханаўскага руху. Факты паказваюць, што амаль ва ўсіх леспрамгасах, у тым ліку і ў буйнейшых, дзе ёсць кампактная маса пастаянных рабочых, разгортванню стаханаўскага руху, вырошчванню стаханаўцаў удзяляецца вельмі мала ўвагі. Парторг ЦК КП(б)Б Брожскага механізаванага лесаўчастка (Бабруйскі раён) тав. Мімухін заявіў на адбываючайся зараз нарадзе парторгаў ЦК КП(б)Б, што «стаханаўскім рухам ніхто не займаўся». І гэта зусім верна.

У лясной прамысловасці, як сярод лесарубаў, так і на возцы — у гаражах, на гужавым транспарце ёсць выдатныя людзі — стаханаўцы, але імі мала хто цікавіцца. У тым-жа самым Брожскім мехпункце, напрыклад, возчык Луцкевіч Марцін выконвае сваю норму на 232 і больш процантаў. Лесаруб Баравой Пётр (Коўчыцкі ўчастак) выконвае норму на 281 процант, трактарыст Пракопчык — на 162 проц.

У Полацкім мехпункце рабочыя Багатыроў, Міхальчанка, Шалуха, Варатэйскі і іншыя выконваюць планы на 190 проц Такіх стаханаўцаў у лясной прамысловасці сотні і тысячы. Яшчэ больш рабочых жадаюць стаць стаханаўцамі. Але лепшыя стаханаўцы мала папулярызуюцца, вопыт перадавікоў не распаўсюджваецца, не перадаецца астатнім рабочым.

Неабходна падтрымліваць ініцыятыву рабочых Рэчыцкага мехпункта, выклікаўшых на соцыялістычнае спаборніцтва рабочы калектыў Бабруйскага мехпункта на лепшае правядзенне асенне-зімовых загатовак і вывазкі. Спаборніцтва паміж леспрамгасамі і мехпунктамі неабходна ўсямерна пашыраць і заахвочваць, бо гэта будзе садзейнічаць уздыму стаханаўскага руху, перадачы вопыту лепшых стаханаўцаў.

Здзіўляе бездапаможнасць, непаваротлівасць прафесіянальных арганізацый, рабачкомаў, райкомаў і асабліва Цэнтральнага праўлення саюза рабочых лесасплаву (старшыня ЦП тав. Яськоў). Запытайце ў работнікаў Цэнтральнага праўлення: хто лепшыя стаханаўцы лесазагатовак і вывазкі? Адказу вы не атрымаеце. Прэзідыум Цэнтральнага праўлення саюза шмат засядае, але мала займаецца масава-вытворчай работай, кіраўніцтвам соцыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскім рухам.

Загатоўкі і вывазка лесу — важнейшая дзяржаўная задача. За яе выкананне адказваюць таксама раённыя партыйныя арганізацыі, райвыканкомы, сельсоветы. Між тым, многія райкомы партыі, райвыканкомы самаўхіліліся ад кіраўніцтва лесазагатоўкамі і лесавывазкай. Райкомы слаба дапамагаюць парторгам ЦК КП(б)Б на мехпунктах у разгортванні масава-палітычнай работы, адарваны ад пярвічных партарганізацый леспрамгасаў, мехпунктаў, не кіруюць імі, не заслухоўваюць іх справаздач і т. д.

Важнейшай умовай паспяховага выканання плана асенне-зімовых лесазагатовак і лесавывазкі, ліквідацыі адставання лясной прамысловасці з'яўляецца перабудова работы самога Наркамлеса, леспрамтрэстаў, леспрамгасаў і мехпунктаў Да нядаўняга часу і Наркамлес і трэсты былі больш органамі па рэгістрацыі прарываў і непаладкаў. А яны павінны быць ператвораны ў баявыя цэнтры аператыўна-тэхнічнага кіраўніцтва. Новае кіраўніцтва Наркамлеса ўжо прадпрыняло рад крокаў у гэтым напрамку У Наркамлесе намечана стварэнне раду новых сектараў і аддзелаў: вытворча-размеркавальнага з трыма групамі, аўтадарожна-дыспетчарскай механізацыі лесазагатовак, працы і заработнай платы.

Усім кіраўнікам лясной прамысловасці, знізу даверху, трэба рашуча пакончыць з канцыляршчынай, пачаць па-большэвіцку працаваць. Правільна расставіць кадры, пабольш клапаціцца аб культурна-бытавых умовах рабочых, рашуча ліквідаваць вынікі шкодніцтва і забяспечыць поўнае і безумоўнае выкананне дзяржаўных планаў.

СХОД ПАРТЫЙНАГА АКТЫВА

ГОМЕЛЬ, 30 верасня адбыўся сход партыйнага актыва горада Гомеля, які абмеркаваў даклад сакратара абкома КП(б)Б тав Жыжэнкова аб задачах партыйнай арганізацыі па вывучэнню гісторыі ВКП(б) па новаму падручніку. Выступіўшыя сакратары парткомаў і прапагандысты расказвалі аб ходзе падрыхтоўкі да вывучэння гісторыі партыі і крытыкавалі гарком КП(б)Б за дапушчаную ў гэтай важнейшай справе шуміху і паралельнасць.

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі. Тав Смірноў расказаў, як партыйная арганізацыя шклозавода імя Сталіна рыхтуецца да вывучэння гісторыі ВКП(б). Гурткі ўкамплектаваны ў адпаведнасці з узроўнем развіцця комуністаў Састаў гурткоў зацверджан партыйным камітэтам. Падабраны прапагандысты, для іх арганізаван семінар, пры партыйным кабінеце наладжаны кансультацыі.

У прынятай рэзалюцыі сход актыва намеціў мерапрыемствы, якія павінны забяспечыць глыбокае вывучэнне гісторыі ВКП(б) у кожнай партыйнай арганізацыі. Гаркому даручана правесці 15-дзённы семінар для 50 прапагандыстаў з адрывам ад вытворчасці, грунтоўна праверыць і падабраць прапагандыстаў, персанальна зацвердзіўшы іх на паседжанні бюро гаркома.

ПАГАДНЕННЕ ЧАТЫРОХ ДЗЯРЖАЎ У МЮНХЕНЕ

ЛОНДАН, 30 верасня. Агенцтва Рэйтэр паведамляе па радыё, што перагаворы ў Мюнхене паміж Чэмберленам, Даладʼе, Мусаліні і Гітлерам закончыліся ў 1 гадзіне 30 мінут. Англія, Францыя, Германія і Італія заключылі пагадненне, якое прадугледжвае пачатак эвакуацыі чэхаславацкіх войск з раёнаў Судэцкай вобласці з пераважаючым нямецкім насельніцтвам 1 кастрычніка і поўны адвод войск — 10 кастрычніка. Пытанне аб плебісцыце ў астатніх раёнах, дзе нямецкае насельніцтва не складае большасці, рашаецца міжнароднай камісіяй. Гэтая-ж камісія будзе вызначаць і новыя граніцы Чэхаславакіі. У састаў камісіі будуць уваходзіць статс-сакратар міністэрства замежных спраў Германіі, французскі, англійскі і італьянскі паслы ў Берліне і прадстаўнік Чэхаславакіі.

Пагадненне прадугледжвае, што ніякія існуючыя пабудовы ў раёнах, якія належаць эвакуацыі, не павінны быць разбураны

Акупацыя Судэцкай вобласці германскімі войскамі будзе ажыццёўлена ў чатыры прыёмы. У раёны, дзе будзе адбывацца плебісцыт, будуць уведзены міжнародныя войскі, якія астануцца там аж да скончэння плебісцыта Міжнародная камісія павінна вызначыць дату, калі ў дадзеным раёне будзе праходзіць плебісцыт. Аднак, пагадненне прадугледжвае, што плебісцыт ва ўсіх раёнах павінен адбыцца не пазней канца лістапада.

Насельніцтву будзе прадастаўлена на працягу шасці месяцаў права антацыі (права выбару грамадзянства, якое прадастаўляецца насельніцтву тэрыторыі, пераходзячай ад адной дзяржавы да другой).

Пагадненне абавязвае чэхаславацкі ўрад на працягу чатырох тыдняў з дня заключэння гэтага пагаднення аслабаніць ад нясення ваенных і паліцэйскіх абавязкаў усіх судэцкіх немцаў, якія гэтага пажадаюць. На працягу гэтага-ж тэрміна чэхаславацкі ўрад абавязваецца аслабаніць усіх асуджаных па палітычных матывах судэцкіх немцаў.

Англія і Францыя бяруць на сябе гарантыі новых граніц Чэхаславакіі на выпадак несправакаванай агрэсіі. Германія і Італія з свайго боку абяцаюць гарантыі новых граніц Чэхаславакіі, але толькі пасля таго, як будзе ўрэгуліравана пытанне аб польскай і венгерскай меншасцях.

У тым выпадку, калі пытанне аб польскай і венгерскай меншасцях у Чэхаславакіі не будзе ўрэгуліравана пагадненнем зацікаўленых дзяржаў на працягу трох месяцаў, удзельнікі нарады ў Мюнхене збяруцца зноў для разгляду гэтага пытання.

Пагадненне перадана чэхаславацкаму ўраду.

Пагадненне падпісана Гітлерам, Чэмберленам, Даладʼе і Мусаліні.

⁂

НЬЮ-ЁРК, 30 верасня. (БЕЛТА). Каментыруючы вынікі мюнхенскай канферэнцыі, газета «Нью Ёрк Таймс» піша, што Англія і Францыя заплацілі за дасягнутую згоду вельмі дарагую цану. «Прынясенне ў афяру малой краіны, велізарнае ўзмацненне найбольш агрэсіўнай і небяспечнай для справы міру дзяржавы, знішчэнне рэшткаў і без таго нетрывалай сістэмы калектыўнай безапаснасці і ліквідацыя магчымасці супрацоўніцтва ЗША з еўрапейскімі дэмакратычнымі дзяржавамі— вось што складае гэтую цану».

27 верасня Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР Г. І. Петроўскі ўручыў ордэны ўзнагароджаным камандзірам РСЧА, зімоўшчыкам вострава Рудольфа, а таксама другім таварышам, узнагароджаным ордэнамі Совецкага Саюза. НА ЗДЫМКУ: група камандзіраў РСЧА, узнагароджаных ордэнамі Саюза ССР (злева направа сядзяць) старшы лейтэнант Н. К. Закурэнкаў, брыгадны інтэндант П. В. Сафонцаў (стаяць злева направа) старшы лейтэнант Ф. І. Масквічоў, малодшы лейтэнант дзяржаўнай безапаснасці І. І. Астроўскі і капітан А. Ф. Усаў. Фото С. Лоскутова (СФ).

Паведамленне агенцтва Рэйтэр

ЛОНДАН, 30 верасня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення агенцтва Рэйтэр, у Празе сёння афіцыяльна абвешчана, што чэхаславацкі ўрад атрымаў праз англійскага пасланніка Ньютона пісьмо главы англійскага ўрада Чэмберлена, у якім гаворыцца, што ён чакае адказу Чэхаславакіі на мюнхенскае пагадненне сёння ў другой палове дня.

Па словах агенцтва, чэхаславацкі ўрад выказаў Ньютону сваё крайняе здзіўленне з повада таго, што яму прадстаўлен такі кароткі тэрмін для абмеркавання пытання, якое мае гістарычнае значэнне.

Чэхаславацкі ўрад прыняў рашэнне мюнхенскай канферэнцыі

ПРАГА, 30 верасня. (БЕЛТА). Мюнхенскае рашэнне было перадана чэхаславацкаму ўраду ноччу 30 верасня праз павераннага ў справах Германіі ў Празе. Урад сумесна з палітычным советам, старшынямі кааліцыйных партый і прадстаўнікамі генштаба засядаў пад старшынствам прэзідэнта Бенеша ўсю ноч і першую палову дня. Па радыё перадана, што ўрад пастанавіў прыняць рашэнне мюнхенскай канферэнцыі.

Вестка аб капітуляцыі чэхаславацкага ўрада ўскалыхнула шырокія народныя масы. На ўсіх пляцах Прагі ля гучнагаварыцеляў, газетных кіёскаў збіраюцца натоўпы народу. На прадпрыемствах выбіраюцца дэлегаты да прэзідэнта і парламента.

ЭВАКУАЦЫЯ З РАЁНАЎ ПАЎДНЁВАЙ ЧЭХІІ

ПРАГА, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). Сёння ноччу пачалася эвакуацыя воінскіх часцей, дзяржаўнай маемасці і грамадзянскага насельніцтва з раёнаў Паўднёвай Чэхіі, пераходзячых да Германіі (раёны, прылягаючыя да аўстрыйскай граніцы). Гэта група раёнаў павінна быць ачышчана да заўтрашняга дня, г. зн. к дню 2 кастрычніка. Эвакуацыя праходзіць параўнаўча спакойна, без якіх-небудзь інцыдэнтаў. Сотні сем'яў, якія астаюцца без прытулку, прыбываюць у Прагу.

⁂

ЛОНДАН, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). Як паведамляе карэспандэнт агенцтва Рэйтэр з Селба (горад на чэхаславацка-германскай граніцы) чэхаславацкія войскі прыступілі да эвакуацыі раёна Хэб, які ўваходзіць у тую частку Судэцкай вобласці, куды германскія войскі будуць уведзены 3, 4 і 5 кастрычніка.

ПОЛЬСКІ УЛЬТЫМАТУМ ЧЭХАСЛАВАКІІ

ПРАГА, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). У поўнач 30 верасня польскі пасланнік у Празе Папе ўручыў міністру замежных спраў Крофта ультыматум польскага ўрада, у якім апошні патрабуе неадкладнай перадачы Польшчы раёнаў Чэхаславацкай Сілезіі і Славакіі з польскім насельніцтвам. Перадача павінна быць пачата 1 кастрычніка і ажыццёўлена ў 4 этапы:

Першая група раёнаў на працягу 24 гадзін; другая—у 48; трэцяя—у 6 дзён. У раёнах, якія адносяцца да чацвёртай групы (раён горада Містэк) і маюць толькі 25 проц. польскага насельніцтва, павінен быць праведзен плебісцыт. Польшча не прызнае ніякага міжнароднага кантролю. Плебісцыт у Містэку павінен быць праведзен па ўступленню польскіх войск.

Раёны, на якія прэтэндуе Польшча, з'яўляюцца буйнымі індустрыяльнымі цэнтрамі Чэхаславакіі: у раёне Мараўскай Остравы размешчан буйнейшы каменнавугальны раён рэспублікі, металургічныя заводы (6 доменных пячэй з 16 дзеючых ва ўсёй Чэхаславакіі) і рад прадпрыемстваў абароннага значэння.

Тэрмін ультыматума канчаецца сёння ў 12 гадзін дня. Калі да гэтага тэрміна чэхаславацкі ўрад не дасць згоды на ачышчэнне раёнаў, польскія войскі ў 2 гадзіны дня пачынаюць акупацыю пунктаў, намечаных на карце, прыкладзенай да ультыматума.

ЧЭХАСЛАВАЦКІ УРАД ПРЫНЯЎ ПОЛЬСКІ УЛЬТЫМАТУМ

ПРАГА, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). Чэхаславацкі ўрад сёння раніцай прыняў польскі ультыматум. Эвакуацыя першай групы раёнаў (Цешын) пачынаецца сёння.

⁂

ЖЭНЕВА, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). Паінфармаваныя жэнеўскія кругі заяўляюць, што прад'яўленне польскага ультыматума Чэхаславакіі ўяўляе сабой загадзя прадуманую і інспіраваную Гітлерам правакацыю, разлічаную на стварэнне ўмоў для поўнай ліквідацыі Чэхаславацкай дзяржавы.

Чэмберлен абяцаў Гітлеру калоніі

ЖЭНЕВА, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). У кругах Лігі нацый сёння пацвярджалі на падставе вестак з афіцыяльных лонданскіх крыніц, што Чэмберлен і Гітлер гутарылі ўчора па пытанню аб пераразмеркаванні калоній Чэмберлен паставіў рашэнне гэтага пытання ў залежнасці ад заключэння паветранага пакта паміж заходнімі дзяржавамі. Пры рашэнні пытання аб калоніях, падкрэсліваюць у Лондане, «брытанская імперыя не павінна быць адзінай, ад якой патрабуюць афяр: Францыя, Бельгія, Галандыя і Партугалія павінны таксама ўдзельнічаць у рашэнні гэтай праблемы, пасля чаго можна будзе ўрэгуліраваць таксама і пытанне аб Далёкім Усходзе і Кітаі».

ПАСЯДЖЭННЕ ПАЛІТБЮРО ЦК ФРАНЦУЗСКАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ

ПАРЫЖ, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). Учора раніцай пад старшынствам Кашэна адбылося пасяджэнне Палітбюро ЦК французскай комуністычнай партыі. Палітбюро заслухала даклад Тарэза аб міжнародным становішчы.

У апублікаваным паведамленні адзначаецца, што ў напружаны момант, калі ад дэмакратычных дзяржаў трэбаваліся асобыя намаганні па абароне міру супроць фашысцкіх пагроз, Даладʼе ўслед за Чэмберленам паспяшыў на дапамогу германскаму агрэсару.

Канферэнцыя чатырох дзяржаў ратыфікавала германскі ультыматум, дапусціўшы, такім чынам, расчляненне Чэхаславакіі, незалежнасць якой з'яўлялася адной з асноўных гарантый безапаснасці Францыі і міру ў Еўропе.

Палітбюро Цэнтральнага Камітэта компартыі Францыі заклікае працоўных узмацніць барацьбу супроць фашызма і ваеннай небяспекі і ўзмацніць выкрыццё падпальшчыкаў вайны — Гітлера і яго пасобнікаў.

ЗАКРЫЦЦЁ СЕСІІ СОВЕТА ЛІГІ НАЦЫЙ

Выступленне тав. М. М. Літвінава

ЖЭНЕВА, 30 верасня. (БЕЛТА). На пасяджэнні совета Лігі нацый быў разгледжан даклад па пытанню аб апеляцыі кітайскага ўрада. Даклад адзначае, што пленум Лігі ўжо ў мінулым годзе прызнаў ваенныя аперацыі Японіі ў Кітаі незаконнымі. У сувязі з гэтым, а таксама з прычыны адмаўлення Японіі ўдзельнічаць у разглядзе апеляцыі, даклад указвае, што «прадугледжаныя 16-м артыкулам мерапрыемствы прымянімы ў сучасных умовах і члены Лігі маюць права не толькі дзейнічаць на падставе рашэння пленума ў мінулым годзе, але таксама індывідуальна прымяняць меры, прадугледжаныя 16-м артыкулам».

Што датычыць узгодненага дзеяння ўсіх членаў Лігі, то з вопыту мінулага ясна, што ўсе неабходныя для гэтага ўмовы ўсё яшчэ адсутнічаюць.

Некалькі членаў совета, у прыватнасці прадстаўнікі Англіі, Францыі, Швецыі, Бельгіі і Латвіі, узялі слова для таго, каб у той ці іншай форме даць зразумець, што яны нічога не збіраюцца рабіць для выканання сваіх абавязацельстваў.

Пасля гэтага выступіў тав. Літвінаў з наступнай кароткай заявай: «Я хачу запэўніць прадстаўніка Кітая ў нашым спачуванні і разуменні яго незадаволенасці прадстаўленым нам дакладам. Я згодзен з ім, што гэты даклад не адпавядае таму, чаго Кітай меў права чакаць ад Лігі нацый. Такімі дакладамі агрэсараў не стрымаць і агрэсію не прыпыніць. Той факт, што нам прыходзіцца абмяжоўвацца такімі дакладамі, яшчэ больш варты жалю ў сучасны момант, калі столькі робіцца па-за Лігай для таго, каб заахвоціць агрэсію і забяспечыць поспех агрэсарам. Мой урад быў-бы гатоў пайсці далей гэтага даклада і прыняць удзел у калектыўных мерапрыемствах, якія дазволілі-б Лізе нацый выканаць усе свае абавязацельствы перад Кітаем. Індывідуальнымі мерамі нямнога можна зрабіць для прыпынення агрэсіі, калі гэтыя меры не будуць праводзіцца іншымі членамі Лігі. Мой урад быў-бы гатоў удзельнічаць у такой каардынацыі калектыўных мерапрыемстваў, але так як другія ўрады не знаходзяць гэтага магчымым для сябе, прыходзіцца галасаваць за гэты даклад».

Выступленне тав. Літвінава было, як заўсёды, заслухана з вялікай увагай.

Пасля заслухання даклада па іспанскаму пытанню старшыня аб'явіў сесію закрытай.

Паведамленне ТАСС

Парыжскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд прэс паведамляе ў Нью-Ёрк, што быццам-бы ўрад СССР упаўнаважыў Даладʼе выступаць на канферэнцыі чатырох дзяржаў у Мюнхене ад імя СССР. ТАСС упаўнаважан паведаміць, што совецкі ўрад ніякіх паўнамоцтваў пану Даладʼе, зразумела, не даваў, роўна, як не меў і не мае ніякіх адносін да канферэнцыі ў Мюнхене і да яе рашэнняў.

Азначанае паведамленне агенцтва Юнайтэд прэс з'яўляецца бязглуздай выдумкай ад пачатку да канца.

ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў ПРАЗЕ

ПРАГА, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). Учора ў Празе ўвесь дзень адбываліся масавыя дэманстрацыі пратэсту супроць рашэння мюнхенскай канферэнцыі аб расчляненні Чэхаславакіі. Тысячы людзей дэманстравалі з нацыянальнымі сцягамі па вуліцах горада. На Вацлаўскай плошчы сабралося некалькі тысяч чалавек. Паведамленне аб згодзе ўрада на тэрытарыяльныя ўступкі было спаткана тут рыданнямі і істэрыкай многіх удзельнікаў дэманстрацыі.

Снаваўшыя ў натоўпе фашысцкія правакатары прабавалі пацягнуць насельніцтва на шлях эксцэсаў і пагромаў. Аднак ніхто не паддаўся на гэтыя правакацыі. Дэманстранты неслі плакаты з надпісамі: «Далоў капітулянтаў!», «Ганьба пасобнікам агрэсараў — Францыі і Англіі!». Паліцыя ацапіла цэнтральныя плошчы горада, перагарадзіўшы дэманстрантам доступ да рэзідэнцыі прэзідэнта, парламента і ўрадавых устаноў.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ САМАЛЁЦЕ „РОДИНА"

30 верасня месцазнаходжанне самалёта «Родина» не знойдзена. Пошукі самалёта авіяцыяй і наземнымі партыямі прадаўжаюцца.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

АБМЕН ВОПЫТАМ РАБОТЫ ВЯСКОВЫХ ПАРТОРГАЎ

* * *

ВЫХОЎВАЦЬ БЕСПАРТЫЙНЫЯ МАСЫ

Наша пярвічная партарганізацыя калгаса «Чырвоны будаўнік» абслугоўвае два сельсоветы — Перкоўскі і Сцяпанаўскі. Памятаючы ўказанні вялікіх правадыроў нашай партыі таварышоў Леніна і Сталіна аб цеснай сувязі з масамі, мы праводзім вялікую масава-палітычную работу сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў гэтых сельсоветаў.

Рэгулярна, у выходныя дні, ў калгасных брыгадах і на іншых участках працуюць 18 гурткоў. У гэтых гуртках калгаснікі вывучаюць рашэнні Першай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР

Культурна-масавая і палітычная работа галоўным чынам канцэнтруецца ў клубе, які ўмяшчае звыш 500 чалавек. Тут сістэматычна праводзяцца гутаркі, лекцыі, даклады, групавыя чыткі газет. Пры клубе ёсць радыёўстаноўка, добрая бібліятэка з вялікай колькасцю палітычнай і мастацкай літаратуры, а таксама па пытаннях агра- і заатэхнікі.

На адну толькі тэму аб гераічнай барацьбе нашых герояў Чырвонасцяжнага Далёкаўсходняга фронта з японскімі самураямі было праведзена 25 гутарак і дакладаў, у якіх прымала ўдзел звыш 3 тысяч чалавек. Усе калгаснікі аднадушна выказвалі свой гнеў па адрасу японскіх бандытаў, якія прабавалі захапіць нашу совецкую тэрыторыю, і захапляліся мужнасцю і храбрасцю нашых байцоў, камандзіраў і палітработнікаў, якія далі па заслугах зарваўшайся японскай ваеншчыне. 80-гадовы калгаснік тав. **Ніжахоўскі** сказаў:

— Калі спатрэбіцца, то я, не гледзячы на свой праклонны ўзрост, з вінтоўкай у руках пайду абараняць сваю любімую радзіму.

За апошні час мы правялі тры даклады аб міжнародным становішчы, некалькі лекцый на антырэлігійную тэму, па пытаннях развіцця сацыялістычнай жывёлагадоўлі і аб унядрэнні агратэхнікі.

За час выбарчай кампаніі па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР у нас вырас выдатны кадр агітатараў з калгаснага актыва. Вялікай папулярнасцю сярод калгаснікаў карыстаюцца ў нас агітатары тт Лазарэнка Фядора, загадчык СТФ, нядаўна прынятая ў кандыдаты партыі, калгасніца Бурдучэнка Марыя, спачуваючая, калгасны брыгадзір тав. Цярэшчанка Майсей, спачуваючы, калгасніца-комсамолка Бабраўнік Марыя і іншы. Простай, зразумелай мовай яны даводзяць да шырокіх мас калгаснікаў жывое бальшэвіцкае слова, інфармуюць аб важнейшых падзеях у нашай краіне і за яе граніцамі.

Перыядычна мы праводзім сходы беспартыйнага актыва. У жніўні месяцы мы правялі чатыры сходы актыва і ў верасні два. Абмеркавалі гаспадарчыя і палітычныя пытанні. Пры сельсоветах пачалі добра працаваць жывёлагадоўчая і зямельная секцыі. Ажывілі сваю работу і грамадскія арганізацыі Асоавіяхіма, МОПР і інш. У часе падзей на Далёкім Усходзе арганізаваўся гурток ППХА ў колькасці 61 калгасніка.

Разгортванне масава-палітычнай работы сярод беспартыйных станоўча садзейнічала росту нашай партыйнай арганізацыі. Калі к моманту правядзення раённага партыйнага схода наша партарганізацыя складалася з двух членаў партыі і аднаго кандыдата, то зараз мы маем трох членаў партыі і пяць кандыдатаў. Спачуваючых у той час зусім не было. Зараз мы маем групу спачуваючых з 6 чалавек. Комсамольская арганізацыя таксама вырасла на 10 чалавек.

П. В. БЛУДЧЫ,
намеснік парторга партарганізацыі калгаса «Чырвоны будаўнік».

* * *

Днямі рэдакцыя газеты «Звязда» разам з Камарынскім РК КП(б)Б правяла нараду парторгаў тэрытарыяльных і калгасных пярвічных партарганізацый. На гэтай нарадзе парторгі падзяліліся вопытам сваёй работы, расказалі аб тым, як яны праводзяць палітычна-выхаваўчую работу сярод беспартыйных мас, сярод совецкай інтэлігенцыі, як яны прымаюць у рады партыі перадавых людзей і т. д. Нарада праходзіла пад кутом гледжання праверкі таго, як выконваюцца рашэнні справаздачна-выбарчых партсходаў.

Ніжэй мы друкуем выступленні парторгаў.

ПЕРАДАВЫЯ ТРАКТАРЫСТЫ УСТУПАЮЦЬ У РАДЫ ПАРТЫІ ЛЕНІНА—СТАЛІНА

Наша партыйная арганізацыя **Іолчанскай** МТС мала ўвагі аддавала росту партыі. На працягу доўгага часу партарганізацыя складалася толькі з двух членаў партыі і аднаго кандыдата.

Праўда, за апошнія некалькі месяцаў у рэзультаце таго што мы палепшылі выхаваўчую работу з беспартыйным актывам, пачалі лепш вывучаць людзей, наша партарганізацыя вырасла да трох членаў партыі і шасці кандыдатаў. Арганізавана таксама група спачуваючых з васьмі чалавек.

Што гэта за людзі, якіх мы прынялі ў рады нашай партарганізацыі? Чым яны заслугоўваюць высокае званне члена партыі Леніна—Сталіна?

Нядаўна мы прынялі ў кандыдаты партыі тав. Ражка Івана Кузьміча Тав. Ражок — выхадзец з бядняцкай сялянскай сям'і, калгаснік. Другі год працуе ў нас трактарыстам На сваім трактары «ХТЗ» ён выканаў план веснавой сяўбы на 200 з лішнім процантаў. Перавыконвае план і зараз. Мае каля 400 кілаграмаў эканоміі гаручага.

Тав. Буднік вядом брыгадзе, як ініцыятар разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва сярод трактарыстаў. Ён таксама з'яўляецца актыўным чытчыкам газет. Сваёй стаханаўскай работай на трактары, сістэматычным выкананнем і перавыкананнем трактарных работ тав. Буднік служыць прыкладам, як трэба адносіцца да соцыялістычнай працы. Гэта ён, тав. Буднік, яшчэ ў часе рамонту трактараў праявіў асаблівую пільнасць, знайшоўшы люку болт, які быў падкінут варожай рукой Зараз тав. Буднік працуе намеснікам комсамольскага арганізатара.

Мы прынялі ў кандыдаты партыі брыгадзіра трактарнай брыгады тав. Бельчанка Васілія Мінавіча. Тав. Бельчанка два годы працаваў трактарыстам. За яго добрыя арганізатарскія здольнасці, высокую дысцыплінаванасць мы ў гэтым годзе вылучылі яго ў брыгадзіры. І не памыліліся. Трактарная брыгада тав. Бельчанка па сваіх вытворчых паказальніках з'яўляецца перадавой у нашай МТС.

У групу спачуваючых намі прынят тав. Шарый Фёдар Платонавіч. Да 1936 года тав. Шарый працаваў у калгасе Калі паўстала пытанне аб пасылцы людзей на курсы трактарыстаў, усе калгаснікі аднадушна прапанавалі кандыдатуру тав. Шарага, як аднаго з лепшых калгаснікаў-ударнікаў. Два годы тав Шарый працаваў трактарыстам. Заўсёды займаў перадавое месца. Высокія ўзоры ўмелага кіраўніцтва паказвае тав Шарый і зараз, працуючы ў якасці брыгадзіра трактарнай брыгады. Яго трактарная брыгада таксама адна з перадавых у МТС.

Наваўступіўшыя ў кандыдаты партыі і групу спачуваючых ахоплены вучобай. Навучаюцца ў школах палітграматы пры калгасах. У зімовы перыяд мы арганізуем спецыяльныя гурткі пры МТС.

Аднак, трэба прызнаць, што работу сярод маладых кандыдатаў і спачуваючых мы яшчэ як належыць не праводзім. Рэдка іх склікаем, мала з імі гутарым, слаба правяраем іх пасяпховасць у вучобе. Гэты прабел нам трэба ліквідаваць.

М. І. МАЗАЛЕЎСКІ,
парторг партарганізацыі Іолчанскай МТС.

* * *

БАЯВЫ ПРАДСТАЎНІК ПАРТЫІ

I.

Каля Чарнігаўшчыны, на прыдняпроўскіх дарогах пяскі вялікія і сыпучыя, як у пустыні.

Шуршыць пад коламі жвір. Наўкруг —сіняя даль палёў. Разлілася рабінавая зара.

Парторг калгаса «Трэці Інтэрнацыянал» Паўлаў Малах Сідаравіч за чатыры годы палюбіў гэтыя мясціны; яму дораг тут кожны прыдарожны камень, кожны кусцік зялёна-кудрага ялоўца, ціхая вада крыніцы, на берагах якой на зары ў гушчыні аера, пахнучага балотам, так зазыўна і прыгожа кракчуць сізакрылыя дзікія селязні і плешчацца буйная рыба.

Сідаравіч — так называюць яго ўсе калгаснікі.

У 1935 годзе, скончыўшы Вышэйшую сельскагаспадарчую школу імя Леніна, прыехаў сюды Сідаравіч. За час вучобы ён азнаёміўся з геніяльнымі творамі Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна, набыў веды па агразаатэхніцы, механізацыі сельскай гаспадаркі. Гарызонт яго ведаў расшыраўся. Ён, як на далоні, бачыў жыццё, кіпучае і многаграннае. Многае далі Сідаравічу два годы крапатлівай партыйнай вучобы.

Новага парторга ў калгасе сустрэлі непрыязна. Не падабаліся эсэру Губару, кулаку Івану Кляпу і былому стражніку Мірону Іовенкаву напорыстасць ў дасягненні пастаўленых мэт, большэвіцкі запал і празорлівасць Сідаравіча і яго рукі, залатыя рукі, пад якімі кіпіць і спявае любая работа.

Часта прышоўшы з работы, парторг знаходзіў у сваёй кватэры на стале запіскі: «Убірайся адсюль, антыхрыст пракляты, покуль не позна. Трыбух распорам і пяском начынім».

Парторг не звяртаў на гэта ўвагі. Ён працаваў няўтомна, днём і ноччу. Скалачваў вакол сябе актыў, граміў ворагаў народа. Умацоўваў калгас, любоўна вырашчваў баявыя кадры большэвіцкай партыі. Да яго прыходу пярвічная партарганізацыя калгаса складалася з двух чалавек. Зараз налічвае яна 29.

Аб'язджаючы на світанні калгасныя брыгады, прыемна ўспамінаць Сідаравічу аб прайшоўшым.

Многа чаго зроблена. Яшчэ большая работа чакае наперадзе.

Сонна шуршыць пад коламі пясок. На дарогу стары садоўнік выносіць у падоле кашулі яблыкі.

— Антонаўачкі, Сідаравіч, налівуныя, — прывітаўшыся, шамкае бяззубым ротам дзед.

У паркане, які шчыльна апаясаў сад, ля дарогі ўпала на зямлю падгніўшая шула. Парторг моўчкі агледзеў яе.

Гэта што, дзед?

Садоўнік вінавата развёў рукамі, сарамліва пераступіў з нагі на нагу.

Трэба паправіць, дзядуля.

II.

Лазар Майсеевіч Кагановіч на XVII партыйным з'ездзе гаварыў:

«Партарганізатар павінен быць баявым прадстаўніком партыі ў цэху. Ён павінен, не парушаючы адзінаначалля, выконваць задачы, якія статут ставіць перад партыйнай арганізацыяй, бароцца з расхлябанасцю, дабіцца на справе жалезнай пролетарскай дысцыпліны».

Ён павінен разгортваць агітацыйную арганізацыю работы ў цэху, у калгасе, змагацца за ажыццяўленне партыйных лозунгаў і рашэнняў, мабілізоўваць масы на выкананне вытворчых заданняў, умацоўваць працоўную дысцыпліну, разгортваць стаханаўскі рух, клапаціцца пра кожнага комуніста, пра ленінска-сталінскае выхаванне.

Іменна такім устае перад намі парторг Паўлаў — баявы прадстаўнік большэвіцкай партыі ў працоўных масах.

За 1938 год у кандыдаты партыі пярвічная партарганізацыя прыняла 16 чалавек, з іх 11 калгаснікаў. Сярод іх лепшыя: свінарка рэспублікі, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР Марыя Петруненка, стаханавец крухмальнага завода тав. Шэйн, лепшы брыгадзір Грыгорый Ядчанка і загадчык паказальнай аўцагадоўчай фермай Васілій Петруненка. У рады спачуваючых прыняты 9 чалавек. Гэта таксама выдатныя людзі калгаснай вытворчасці.

Пярвічная партарганізацыя выхавала многа людзей, якія сёння вылучаны на кіруючыя пасты партыйнай і совецкай работы. Для прыкладу ўзяць хоць-бы Марыю Петруненку, у мінулым непісьменную вясковую дзяўчыну. Тав. Паўлаў многа дапамагаў ёй у вучобе і падрыхтоўваў яе да ўступлення ў рады партыі. Сёння яна вырашае народныя справы ў Вярхоўным Совеце рэспублікі. Каця Гудзёнак у мінулым таксама была звычайнай калгасніцай, зараз—інструктар райкома партыі, старшыня сельсовета. Тав. Сцепаненка — быў член пярвічнай арганізацыі калгаса «Трэці Інтэрнацыянал» — працуе [illegible]

Комуністы партарганізацыі многа працуюць над павышэннем агульнаадукацыйнага ўзроўню, вывучаюць мову, матэматыку, геаграфію. Пры арганізацыі працуе партыйна-кандыдацкая школа, якою кіруе дырэктар сямігодкі Хана Алеўская. У калгасах сельсовета працуе 60 гурткоў бягучай палітыкі; імі кіруюць комуністы.

За свой рабочы дзень Сідаравіч паспее пабываць і ў бальніцы, і ў школе, на брыгадным сходзе, у кожнай хаце калгасніка і на полі ля трактара. Усюды ён няўтомны, баявы прадстаўнік партыі — працуе, дае ўказанні, парады.

— Залаты чалавек, — гавораць пра яго ў раёне.

Анат. ВЯЛЮГІН,
З. ЛАРЫСАЎ.

Камарынскі раён.

НАША СОВЕЦКАЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ

Яркай ілюстрацыяй актыўнага ўдзелу совецкай інтэлігенцыі ў соцыялістычным будаўніцтве з'явілася яе вялікая работа ў падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. У часе выбарчай кампаніі па нашаму Крукаўскаму сельсовету працавала 37 гурткоў, дзе працоўныя масы вывучалі Канстытуцыю і Палажэнне аб выбарах у Вярхоўныя Советы. Агітацыйную работу ў 27 гуртках вялі настаўнікі школ сельсовета. Чатырма гурткамі кіравалі медыцынскія і ветэрынарныя работнікі. Настаўнікі-комсамольцы тт. Волкаў, Быхоўскі і Арцюшэнка працавалі сакратарамі ўчастковых выбарчых камісій.

Гэтая-ж колькасць гурткоў працуе і зараз. Кожны тыдзень збіраюцца калгаснікі на заняткі і вывучаюць рашэнні Другой Сесіі Вярхоўнага Совета СССР. Апрача гэтага працуюць брыгады чытчыкаў, якія знаёмяць працоўныя масы з апошнім становішчам на франтах рэспубліканскай Іспаніі, Кітая. Сярод кіраўнікоў гурткоў і чытчыкаў — пераважная колькасць нашай совецкай інтэлігенцыі. Лепшымі агітатарамі з'яўляюцца беспартыйныя урач тав. Дзенісенка, ветэрынарны фельчар тав. Казлоў, зубны ўрач тав. Дыгейка, настаўнікі тт. Арцюшэнка і Быхоўскі. Апошнія два прыняты ў кандыдаты партыі.

Асабліва трэба адзначыць настаўніка-агітатара тав. Волкава. Гэта актыўны комсамолец, добры масавік.

У часе ўборкі комуністы арганізавалі з лепшых комсамольцаў - настаўнікаў брыгады чытчыкаў. Чытчыкі праводзілі на полі культурна-масавую работу, выпускалі насценгазеты. Многа нам дапамагае совецкая інтэлігенцыя ў выкананні абавязацельства ў перад дзяржавай.

Мы многа працуем з совецкай інтэлігенцыяй. Гэту непарыўную сувязь будзем і ў далейшым яшчэ больш умацоўваць.

А. Г. БУДНІК,
намеснік парторга Крукаўскага сельсовета.

На парадзе парторгаў Камарынскага раёна. Фото Я. Салавейчыка.

ЯК МЫ ПРАЦУЕМ З ПАРТОРГАМІ

* * *

З. К. БЕЙНЕНСОН
САКРАТАР КАМАРЫНСКАГА РАЙКОМА ПАРТЫІ

* * *

У рэзультаце выбараў кіруючых партыйных органаў амаль поўнасцю змяніўся састаў кіраўнікоў пярвічных партарганізацый. Партыйныя арганізатары ў нашым Камарынскім раёне — гэта маладыя партыйныя работнікі з невялікім партыйным стажам і небагатым вопытам партыйнай работы. Многія з іх у мінулым на партрабоце зусім не былі.

Напрыклад, парторг пярвічнай партарганізацыі Крукаўскага сельсовета тав. М. Шульга. Ён член партыі з 1937 года, дырэктар школы, на партрабоце ўпершыню. Тав. Расюк — парторг пярвічнай арганізацыі Калыбанскага сельсовета, старшыня калгаса «Чырвоны араты» — таксама ніколі на партыйнай рабоце не быў.

Гэта ўскладае на райком партыі, на яго апарат, сакратароў райкома абавязак узмоцнена дапамагаць партарганізатарам у іх штодзённай рабоце, умела імі кіраваць, аб чым комуністы раёна асабліва падкрэслівалі ў сваіх наказах на справаздачна-выбарчых партыйных сходах.

Як-жа мы працуем з парторгамі?

Мы практыкуем заслухоўванне парторгаў па асобных пытаннях на пасяджэннях райкома партыі. З моманту правядзення раённага партыйнага схода мы заслухалі парторга калгаса «Трэці Інтэрнацыянал» тав. Паўлава — аб росце партыі і аб падрыхтоўцы да партсходаў, тав. Даніленку — парторга калгаса «Чырвоны будаўнік» — аб рабоце з беспартыйным актывам і аб кіраўніцтве комсамольскімі арганізацыямі. Парторг партарганізацыі Калыбанскага сельсовета тав. Расюк далажыў райкому аб партыйнай рабоце на ўборцы.

За гэты-ж час мы правялі чатыры нарады парторгаў Абмеркавалі пытанні: аб падрыхтоўцы да раённага партсхода, аб задачах партарганізацый па падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР, аб росце партыі і аб партыйнай гаспадарцы Апошняя нарада адбылася 8 верасня, на якой мы абмеркавалі два пытанні — аб падрыхтоўчай рабоце да правядзення выбараў у комсамольскай арганізацыі і аб выбарчай кампаніі ў сістэме спажывецкай кааперацыі. Як правіла, парторгі папярэдне апавяшчаюцца аб парадку нарады з тым, каб яны маглі раней добра прадумаць прадстаячае пытанне.

Самі нарады праходзяць з вялікай актыўнасцю і дзелавітасцю Вынікі нарад абмяркоўваюцца на сходах пярвічных партарганізацый.

Апрача гэтага парторгі прымаюць актыўны ўдзел у рабоце нарад старшынь калгасаў, сельсоветаў, на якіх абмяркоўваюцца гаспадарча-палітычныя пытанні. Так, напрыклад, з 29 па 31 жніўня па ўсіх сельсоветах былі праведзены нарады работнікаў жывёлагадоўлі з удзелам парторгаў па пытанню аб падрыхтоўцы жывёлы да зімоўкі. У мінулым месяцы яны таксама прымалі ўдзел у нарадзе, прысвечанай стаханаўскаму месячніку па дарожнаму будаўніцтву

Але мы не абмяжоўваемся толькі адным заслухоўваннем парторгаў на пасяджэннях райкома і правядзеннем нарад Галоўнае, на што мы звяртаем увагу, — гэта на жывую сувязь з парторгамі, на дачу жывога інструктажа, указанняў Тут вялікую ролю адыгрываюць інструктары райкома партыі Інструктары райкома многім партарганізацыям дапамаглі скласці планы работ, прымаюць удзел у падрыхтоўчай рабоце да партсходаў, кіруюць кожны ў сваёй зоне школамі партасветы, даводзяць да комуністаў рашэнні партыі і ўрада, абкома і райкома партыі, інфарміруюць сакратароў аб становішчы і справах у партарганізацыях.

Наша (сакратароў райкома) сувязь з парторгамі рознастайная. Яна праяўляецца ў асабістых гутарках непасрэдна ў райкоме партыі, у выездах на месцы, ва ўдзеле ў рабоце партсходаў. За тры месяцы нашай работы мы, сакратары райкома, пабывалі ва ўсіх пярвічных партарганізацыях, а ў некаторых — па некалькі разоў Мы на практыцы пераканаліся, што выезд на месцы ў пярвічныя партарганізацыі — самы лепшы від кіраўніцтва Ён прыносіць вялікую карысць не толькі партарганізацыям, але і нам, работнікам райкома, у сэнсе лепшага азнаямлення са справамі партарганізацый, з работай і бытам комуністаў.

Знаёмячыся са справамі ў Калыбанскай партыйнай арганізацыі, я сустрэўся з такім фактам: парторг тав. Расюк на працягу трох тыдняў не прыняў на ўчот комуніста т. Ігнатоўскага. Яго прымацавальны талон тав Расюк проста насіў у сябе ў кішэні. Гэты факт навёў мяне на думку: тут-жа на месцы праверыць вядзенне ўсёй партыйнай гаспадаркі, што мною і было прароблена. Я ўказаў тав. Расюку на недахопы ў яго рабоце і аб тым, як іх знішчыць. Па дагаворанасці з тав Расюком гэта пытанне было абмеркавана на сходзе пярвічнай партарганізацыі.

Такіх прыкладаў можна прывесці многа. Трэці сакратар райкома тав. Серыкаў, будучы ў партарганізацыі калгаса «Трэці Інтэрнацыянал», практычна дапамог парторгу тав. Паўлаву аформіць дакументы таварышаў, якія падалі заявы аб уступленні ў партыю.

Яшчэ адзін характэрны прыклад. Будучы ў партарганізацыі Верхне-Жураўскага сельсовета, я атрымаў ад калгасніцы-комсамолкі тав. Максіменка паведамленне аб тым, што з боку былога старшыні сельсовета, кандыдата партыі К., было контррэвалюцыйнае выступленне. Гэты факт пацвердзіўся. Рашэннем райкома К быў выключан з партыі, а потым аказаўся ворагам народа. Дарэчы тав. Максіменка ў сучасны момант прынята ў кандыдаты партыі.

Комуністы пры выбарах парторгаў не памыліліся ў сваіх кандыдатурах Сваёй практычнай работай яны апраўдваюць давер'е комуністаў Яны здолелі па-большэвіцку ўзначаліць правядзенне выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Асабліва хочацца адзначыць работу парторга пярвічнай партарганізацыі калгаса «Трэці Інтэрнацыянал» тав. Паўлава Гэта партарганізацыя вызначалася ўмелым правядзеннем масава-палітычнай работы, згрупаваннем вакол пярвічнай партарганізацыі вялікага беспартыйнага актыва. У рэзультаце — выбары ў соцыялістычны парламент ордэнаноснай БССР прайшлі з стопроцантнай яўкай выбаршчыкаў і аднадушнай аддачай сваіх галасоў за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных Выхаванка гэтай партарганізацыі — калгасніца тав. Петруненка Марыя Васільеўна—выбрана дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР.

У рэзультаце праведзенай работы з беспартыйным актывам партарганізацыя Перкаўскага сельсовета (парторг тав Даніленка) за апошні час прыняла ў кандыдаты партыі 6 перадавых калгаснікаў 6 калгаснікаў прынята ў групу спачуваючых

Тав. Даніленка цесна звязан не толькі з комуністамі, але і з шырокай масай беспартыйных калгаснікаў чула прыслухоўваецца да іх голасу Тав Даніленка праявіў сябе здольным кіраўніком, добрым арганізатарам. Парторг Крукаўскага сельсовета тав. Шульга здолеў добра мабілізаваць комуністаў і беспартыйных на большэвіцкае правядзенне сельскагаспадарчых работ. Комуніст тав Пугач (старшыня калгаса «Ільіч») здолеў вывесці калгас з прарыву і паставіць яго ў рады перадавых калгасаў раёна.

Тав. Шульга працуе дырэктарам школы. Гэта школа была засмечана антысовецкімі элементамі Тав Шульга правёў работу па яе аздараўленню. Гэта партарганізацыя толькі месяц таму назад афармілася ў кандыдацкую групу і за гэты час прыняла ў свае рады трох таварышаў у кандыдаты партыі і аднаго ў спачуваючыя.

У рэзультаце разгортвання партыйна-масавай работы сярод беспартыйных партарганізацыя Камарынскага раёна са студзеня вырасла больш чым у два разы — з 62 да 130 чалавек

Але ў нашай рабоце з парторгамі яшчэ ёсць многа недахопаў. Мы, напрыклад, даем многа дырэктыў і ўказанняў, але не заўсёды правяраем іх выкананне. Праўда, за апошні час мы пачалі больш рэгулярна правяраць выкананне дырэктыў райкома партыі.

Усе парторгі наведваюць школы, вывучаюць гісторыю партыі. У сучасны момант 6 парторгаў з 15 навучаюцца на месячных курсах пры абкоме партыі. Але гэта яшчэ недастаткова. Парторгі настойліва і зусім правільна патрабуюць, каб ім чыталі кваліфікаваныя даклады і лекцыі аб міжнародным становішчы і на іншыя палітычныя тэмы Мы-ж гэтыя запатрабаванні комуністаў яшчэ вельмі слаба задавальняем.

Сувязь з парторгамі яшчэ таксама нельга лічыць дастатковай. Вельмі часта работнікі райкома партыі бываюць у партарганізацыях, гавораць аб усім, цікавяцца ходам сельскагаспадарчых работ, але аб партыйнай рабоце забываюць.

Не ўсе партарганізацыі аддаюць належную ўвагу росту партыі. Напрыклад, партарганізацыя Камарынскага сельсовета (парторг тав Саракалетаў) за гэты год не прыняла ў рады партыі і ў групу спачуваючых ні аднаго калгасніка. Адстаюць таксама партарганізацыі Калыбанскага і Верхне-Жураўскага сельсоветаў (парторгі тт. Расюк і Іваноў).

Некалькі слоў аб кіраўніцтве парторгамі з боку Палескага абкома партыі. Інструктары абкома — рэдкія госці ў партарганізацыях, а калі і прыязджаюць, то трымаюць слабую сувязь з парторгамі. Будзе вельмі правільна, калі мы скажам, што інструктары абкома ператварыліся ва ўчотчыкаў. Яны патрабуюць толькі весткі. Што-ж датычыць жывой дапамогі, то гэтага, на жаль, яшчэ няма.

Кіруючыся ўказаннямі комуністаў, мы не абмяжоўваемся дасягнутымі поспехамі, а яшчэ больш умацоўваем жывую дапамогу парторгам у іх штодзённай партыйнай рабоце, дабіваючыся паляпшэння палітычнай і партыйна-масавай работы сярод членаў і кандыдатаў партыі і непартыйных большэвікоў.

Комуністы індывідуальна зараз знаёмяцца з выдатным дакументам нашай партыі — Кароткім курсам гісторыі ВКП(б). Райком партыі галоўную ўвагу ўдзяляе падрыхтоўцы прапагандысцкіх кадраў, іх падбору. Каб вылучыць прапагандыстамі палітычна падрыхтаваных, бязмежна адданых нашай краіне таварышаў. Глыбока вывучаючы слаўныя старонкі гісторыі большэвіцкай партыі, наша партарганізацыя яшчэ больш узніме сваю ідэйную узброенасць, павысіць рэвалюцыйную пільнасць, яшчэ цясней згуртуецца вакол Сталінскага Цэнтральнага Камітэта.

ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ
[С]ЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА
ПРАДПРЫЕМСТВАЎ БССР.

ЗЛЕТ СТАХАНАЎЦАЎ ГОМЕЛЯ

ГОМЕЛЬ, 1 кастрычніка. Вечарам 29 [ве]расня адбыўся агульнагарадскі злёт [ст]аханаўцаў і інжынерна-тэхнічных ра[бо]тнікаў прадпрыемстваў горада. На [зл]ёце прысутнічала 600 чалавек. Дак[ла]дам аб рабоце прамысловасці гора[да] выступіў старшыня горсовета — [дэ]путат Вярхоўнага Совета СССР тав. [Ц]інагенаў.

Перадкастрычніцкае соцыялістычнае [сп]аборніцтва выклікала новую хвалю [в]ытворчага ўздыму на прадпрыемст[ва]х горада. Калектывы фабрык «Па[лес]друк», імя Клары Цэткін, завода [«Г]омсельмаш», Тлушчакамбінат па[ка]зваюць добрыя ўзоры работы. На [пр]адпрыемствах Гомеля цяпер наліч[ва]ецца звыш 10 тысяч стаханаўцаў, [як]ія з дня ў дзень перавыконваюць [св]ае нормы.

На злёце выступілі стаханаўцы тт. [К]аплан (Палесдрук), Юдашкін (кам[бі]нат імя Ежова), Фельдман (камбінат [«С]партак») і іншыя. Яны падзяліліся [до]пытам стаханаўскай работы. 750 ра[бо]чых Палесдруку, рыхтуючы дастой[на]ю сустрэчу вялікаму Кастрычніку, [за]ключылі індывідуальныя дагаворы. [Ра]бочы пераплётнага цэха тав. Фіш[ма]йн, уступаючы ў спаборніцтва, аба[вя]заўся выконваць сваю норму на 300 [пр]оцантаў. Цяпер ён яе выконвае на [30]0—400 процантаў штодзенна.

Пад бурныя апладысменты ўдзель[ні]кі злёта прынялі прывітальную тэ[ле]граму правадыру народаў тавары[шу] Сталіну.

Наперадзе— стаханаўскі цэх

БАБРУЙСК. (Кар. «Звязды»). На [пр]адпрыемствах горада шырока раз[га]рнулася соцыялістычнае спаборніц[тв]а за дастойную сустрэчу XXI гада[ві]ны Кастрычніка. Стаханаўцы, удар[ні]кі, рабочыя фабрык і заводаў [Б]абруйска, рыхтуючыся да гэтай зна[ме]нальнай даты, паказваюць узоры [пр]адукцыйнасці працы.

Рабочыя мэблевай фабрыкі імя Хал[ту]рына 23 верасня выканалі датэрмі[но]ва план трэцяга квартала. Выпу[ш]чана прадукцыі на 425 тыс руб. [Р]абочы калектыў змагаецца за выка[на]нне гадавога плана да 5 снежня. [Н]а фабрыцы шырока разгарнулася [со]цспаборніцтва. Наперадзе ідзе су[ш]ыльна стаханаўскі цэх па вырабу стул[ь]яў, які выканаў свой план да 20 ве[ра]сня на 133 проц. Стаханаўка-комса[мо]лка тав. Шапяткоўская, стаханавец [...] выконваюць свае нормы больш чым на 200 проц.

*

Рабочыя скургалантарэйнай фабрыкі [імя] Куйбышава абавязаліся выпусціць [да] XXI гадавіны Вялікай Кастрычніц[ка]й соцыялістычнай рэвалюцыі на [5]0 тысяч рублёў прадукцыі звыш пла[на], зэканоміць 140 тысяч дэцыметраў [ску]ры, 5 тысяч метраў тэкстыльнага [ма]тэрыялу і павысіць выпуск прадук[цы]і першага сорта да 84 проц. па пла[ну] да 90 проц.

Вызначана рад прадпрыемстваў па [ма]ацаванню абароннай работы. Калек[ты]ў фабрыкі абавязаўся падрыхта[ва]ць 100 значкістаў ППХА, 50 значкі[ст]аў ГСА і 20 варашылаўскіх стралкоў. Многія стаханаўцы, уключыўшыся ў [пе]радкастрычніцкае соцыялістычнае [сп]аборніцтва, значна павысілі прадук[цы]йнасць працы і палепшылі якасць [в]ыпускаемай прадукцыі.

Стаханаўка сталярнага цэха тав. [Ш]ўйшыц сістэматычна выконвае сваю [н]орму на 200—250 проц. Комсамолка-[ст]аханаўка сумежнага цэха тав. Рабі[н]овіч, значна перавыканаўшая свой [га]давы план яшчэ да 1 верасня г.г., [в]ыконвае норму звыш як на 200 проц. [8]4 проц. норм дае комсамолка ушыль[на]га цэха тав. Ачісевіч.

ТАМ, ДЗЕ ВЫРАБЛЯЮЦЬ ЦВІКІ

Воддаль ад чыгункі, за дзесяць кілометраў ад Оршы размешчан цвіковы завод «Чырвоны Кастрычнік». Гэта прадпрыемства мае ўсесаюзнае значэнне. Яно вырабляе такія важнейшыя прадметы, як будаўнічыя цвікі, тэкс (маленькія цвічкі для абутковай прамысловасці) англійскія булаўкі, галантарэйную і скурабутковую фурнітуру, у якіх адчуваюць вялікую патрэбу розныя галіны прамысловасці. Буйнейшыя абутковыя фабрыкі Саюза працуюць на машынным тэксе, які выпрацоўваецца на «Чырвоным Кастрычніку».

З розных канцоў краіны: з Ташкента, Тбілісі, Масквы, Харкава, Свердлоўска, Растова прыязджаюць на завод за атрыманнем заннараджанай прадукцыі.

А завод з месяца ў месяц не выконвае сваёй вытворчай праграмы. Толькі за 8 месяцаў гэтага года недадана прадукцыі на 409 700 рублёў. Краіна недаатрымала 868,2 тоны будаўнічых цвікоў, 9 тон тэксу і т. д.

Няма ніякага паляпшэння і ў верасні. За першую дэкаду план выканан на 21,4 проц., у тым ліку па такому важнейшаму асартыменту, як будаўнічыя цвікі — на 24,7 проц., па машыннаму тэксу — на 14,1 проц.

Завод забяспечан поўнасцю сыравінай, мае ўсё неабходнае для выканання плана. Чаму-ж ён увесь час у прарыве? На гэта пытанне вам ні ў Наркаммясцпроме, ні ў Метызтрэсце ніхто не адкажа. Не ведаюць у наркамаце чым хварэе прадпрыемства, не прымаюць мер да яго аздараўлення.

За апошні год на «Чырвоным Кастрычніку» змяніліся чатыры дырэктары. Месяц таму назад прызначан пяты, але становішча на заводзе не змянілася. Папаўняецца толькі адна папка дырэктарскіх загадаў, а ўсё астатняе астаецца па-ранейшаму.

На прадпрыемстве фактычна няма ніякага тэхнічнага кіраўніцтва. Безадказнасць, бескантрольнасць пачынаецца з першых-жа працэсаў вытворчасці. Паступаючая на завод провалка-катанка выгружаецца прама на двары, ля цэхаў. Склада няма. Начальнікі цэхаў, майстры бяруць провалку для апрацоўкі без уліку і вагі, колькі каму захочацца. Такое-ж становішча з іншымі відамі сыравіны (масла, вугаль, інструментальная сталь).

Атрымліваючы провалку для апрацоўкі, ні адзін рабочы не ведае, колькі-ж павінна выйсці з яе цвікоў. Планавыя заданні да кожнага станка, аддзялення, цэха, да рабочых не даводзяцца, людзі тут працуюць усляпую.

У цэхах існуе паўнейшая абязлічка. Майстры, начальнікі цэхаў не перадаюць адзін аднаму свае змены і ніхто ні за што не адказвае. Станкі і машыны абраслі брудам, ніхто іх не чысціць. Калі паламаецца станок (а гэта бывае вельмі часта), то цяжка знайсці вінаватых. Гэтаму спрыяе яшчэ сямейнасць і кругавая парука, якія моцна ўкараніліся на вытворчасці. Нядаўна ў провалачным цэху здарыўся такі выпадак. Паламаўся толькі-што адрамантаваны провалачны стол. Тры дні «шукалі» вінаўніка паломкі для складання акта.

Неахайныя, злачынныя адносіны да абсталявання патураліся на працягу ўсяго часу кіраўнікамі завода. Аб гэтым ярка сведчыць рост прастояў. У чэрвені завод прастаяў 2.998 чалавека-гадзін, у ліпені — 8.543, у жніўні — 7.933. Прычын прастояў ніхто не высвятляе, а вінаўныя не прыцягваюцца да адказнасці.

Зусім слабая працоўная дысцыпліна на вытворчасці. Прагулы, спазненні на работу тут сталі звычайнай з'явай. Ёсць выпадкі прыходу на работу ў нецвярозым выглядзе.

На заводзе ёсць нямала старых рабочых-кадравікоў, добрых стаханаўцаў (тт. Нікіціна, Румінаў, Мядзвецкі і інш.), якія адданы вытворчасці. Але імі ніхто не цікавіцца, іх метады не распаўсюджваюцца сярод усёй масы рабочых. І гэта ў той час, як у некаторых цэхах (провалачны, галантарэйны) 50 проц. рабочых не выконваюць сваіх норм.

Масава-палітычная работа праводзіцца нездавальняюча. Сходы склікаюцца тут вельмі рэдка. Заўком (намеснік старшыні Корбан В.) ніякай работы не праводзіць.

Партыйная арганізацыя (сакратар парткома тав. Зарэцкі) пляцецца ў хвасце, не мабілізоўвае рабочы калектыў на ліквідацыю ганебнага прарыву.

Новапрызначаны дырэктар завода тав. Андронаў энергічна ўзяўся за навядзенне парадку на вытворчасці, але яму патрэбна аказаць дапамогу.

Нямала пабывала за апошні час на заводзе прадстаўнікоў Белметызтрэста. Доўгі час тут сядзеў галоўны інжынер трэста Федарчук, але толку, як відаць, ад гэтага зусім мала.

Калектыў завода «Чырвоны Кастрычнік» абавязан у найкарацейшы тэрмін вывесці прадпрыемства з прарыву. Для гэтага ёсць усе магчымасці.

І. ВАСІЛЬКОЎ.

Нашто стварылі абласныя аддзелы харчовай прамысловасці?

(Пісьмо ў рэдакцыю)

Пастановаю СНК БССР былі створаны абласныя аддзелы харчовай прамысловасці пры аблвыканкомах Менскай, Гомельскай, Магілёўскай, Віцебскай і Палескай абласцей.

Паводле выпрацаванага наркаматам палажэння, абласныя аддзелы былі заклікаы кіраваць прадпрыемствамі харчовай прамысловасці абласнога значэння, а таксама ажыццяўляць кантроль над прадпрыемствамі рэспубліканскага і саюзнага значэння, што знаходзяцца на тэрыторыі данай вобласці.

Наркаматам былі прадстаўлены спіскі прадпрыемстваў, якія падлягаюць перадачы ў абласное падпарадкаванне, што і зацверджана СНК БССР. З таго часу прайшло тры месяцы. Арганізаваны аддзелы і ў асноўным укамплектаваны штаты. Але прадпрыемствы наркаматам не перададзены і на працягу трох месяцаў не вырашана пытанне, чым павінны займацца абласныя аддзелы. Ніхто не кіруе аддзеламі і не патрабуе ад іх работы, а ўтрыманне штатаў аддзелаў у абласцях абыходзіцца дзяржаве нямала. Адна зарплата складае, прыкладна, каля 100 тысяч рублёў.

Як відаць, Наркамхарчпром лічыць, што аблхарчпромы не справяцца з задачамі, якія меркаваліся на іх ускласці. Значыць, неабходна вырашыць пытанне аб мэтазгоднасці іх існавання.

ЗАРЭЦКАЯ, БЕРСОН,
начальнікі абласных харчовых аддзелаў Менска і Гомеля.

АРГАНІЗАВАНЫ ДВА НОВЫЯ КАЛГАСЫ

БАРЫСАЎ. (Кар. «Звязды»). За апошні час у раёне назіраецца масавы прыліў аднаасобных гаспадарак у калгасы. У верасні прыняты членамі сельскагаспадарчых арцеляў больш 100 аднаасобных гаспадарак. У калгас «Ударнік», Каспюкоўскага сельсовета, уступіла 11 новых гаспадарак. У раёне арганізаваны два новыя калгасы. У вёсцы Яблонаўка, Вяляціцкага сельсовета, арганізаван новы калгас імя Другой Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, які яднае 14 гаспадарак. Новыя калгаснікі дружна ўзяліся за гаспадарчае ўмацаванне арцелі. Арцель атрымала ад дзяржавы 15 цэнтнераў сартавога насення. Скончыўшы асеннюю сяўбу, калгаснікі зараз прыступілі да зяблівага ворыва і падрыхтоўкі цёплай і сытай зімоўкі жывёле.

ПАСКОРЫЦЬ УВЯДЗЕННЕ ПРАВІЛЬНЫХ СЕВАЗВАРОТАЎ

Увядзенне правільных севазваротаў [у] калгасах мае велізарнае гаспадарча-[па]літычнае значэнне ў далейшым раз[ві]цці сельскай гаспадаркі, у павышэн[ні] ураджайнасці, у барацьбе за за[м]ожнасць, зашчаслівае і радаснае [жы]ццё калгаснікаў.

Злейшыя ворагі народа — трацкісц[к]а-бухарынскія і нацыянал-фашысцкія [б]андыты ўсяк імкнуліся сарваць [у]вядзенне правільных севазваротаў і [т]ым самым знізіць ураджайнасць [к]алгасных палёў, падарваць магут[н]асць непераможнага калгаснага ладу.

Севазварот — важнейшае агратэхнічнае мерапрыемства ў падняцці ураджайнасці. Ворагі народа трактавалі севазварот як простае чаргаванне культур. Севазвароты ўводзіліся агранамічна нявытрыманымі. Даводзіліся празмерна вялікія пасеўныя планы, не ўкідаліся ў пар [...] пад папар. У выніку — калгасы вымушаны былі парушаць элементарныя агратэхнічныя мерапрыемствы па павышэнню ўраджайнасці.

У нашым Дрыбінскім раёне глебы пясчаныя, супясчаныя і суглінкавыя. На гэтых глебах патрабуюцца самыя ўважлівыя адносіны да паляводства. Аднак, ворагі народа прыклалі і тут сваю брудную лапу. Яны амаль поўнасцю ўліквідавалі ў раёне пасевы лупіну і грэчкі. Без гэтых культур амаль немагчыма весці сельскую гаспадарку.

Ліквідуючы вынікі шкодніцтва, ЦК ВКП(б) і СНК СССР у сваёй гістарычнай пастанове ад 2 жніўня 1937 года «Аб дапамозе калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання» пастанавілі ў бліжэйшы час увесці правільныя севазвароты ў калгасах нашай рэспублікі.

Аднак пастанова партыі і ўрада аб увядзенні правільных севазваротаў не выканана поўнасцю. Напрыклад, Дрыбінскі раён мае 144 калгасы. Севазвароты-ж уведзены толькі ў 29-ці. К канцу гэтага года севазвароты будуць уведзены яшчэ ў 20 калгасах. Зразумела, што гэта лічба не можа задаволіць жаданняў калгаснікаў.

Марудлае ўвядзенне севазваротаў тлумачыцца тым, што Наркамзем БССР, абласныя і раённыя зямельныя аддзелы не правялі своечасова і ў дастатковай колькасці падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў для работ па ўвядзенню севазваротаў. У раёнах адсутнічае патрэбная дапамога аграномам, якія працуюць па складанню севазваротаў.

Характэрна прывесці такі факт. Нядаўна старшы агроном і загадчык райза Дрыбінскага раёна ездзілі ў Наркамзем з гатовым праектам севазвароту аднаго калгаса. Яны хацелі, каб спецыялісты Наркамзема праверылі, ці правільна зроблен севазварот. Цэлы дзень прахадзілі яны па пакоях Наркамзема, і ніхто толкам не выслухаў іх і не даў патрэбнай кансультацыі. Такую ж «дапамогу» аказаў і магілёўскі абласны зямельны аддзел.

Гэтыя факты яшчэ раз гавораць аб тым, што Наркамзем дрэнна ліквідуе вынікі шкодніцтва, не спяшаецца з увядзеннем правільных севазваротаў у калгасах.

У пасеўных планах, якія даводзіць Наркамзем, дрэнна ўлічваюцца глебавыя асаблівасці раёнаў. Вось, напрыклад, у нашым раёне глеба пераважна пясчаная і супясчаная. Тут добра расце такая каштоўная культура, як грэчка. Між тым план сяўбы грэчкі ў 1938 годзе давядзен быў усяго ў 640 гектараў.

Мы можам, і гэта неабходна ў інтарэсах далейшага развіцця сельскай гаспадаркі, значна павялічыць пасевы грэчкі шляхам некаторага скарачэння пасеваў яравых-каласавых.

На тэрыторыі нашага раёна знаходзяцца два спіртзаводы і крухмальны завод. Улічваючы гэта, тут можна павялічыць пасевы бульбы. Да таго-ж глеба спрыяе гэтаму.

Усё гэта, на мой погляд, трэба ўлічваць пры складанні севазваротаў. Нам патрэбны севазвароты, якія-б поўнасцю адпавядалі размяшчэнню дзяржаўных планаў сяўбы, правільнаму выкарыстанню сельскагаспадарчых угоддзяў, далейшаму развіццю жывёлагадоўлі.

Улічваючы вялікае дзяржаўнае значэнне севазваротаў, нядрэнна было-б, каб Наркамзем на перыяд увядзення севазваротаў увёў пры раённых зямельных аддзелах штатнага работніка-агранома, які-б займаўся выключна пытаннямі севазвароту. Такое мерапрыемства дапаможа забяспечыць хутчэйшае і высокаякаснае ўвядзенне севазваротаў ва ўсіх калгасах.

А. С. ГАРНАСТАЕЎ,
намеснік загадчыка Дрыбінскага райза, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.



НА ЗДЫМКУ (злева направа): герой-кулямётчык тав. Гальянаў, які забіў у часе бою на вышыні Заазёрнай больш ста японскіх самураяў, артыст Чырвонасцяжнага ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі СССР тав. Мілавідаў і лейтэнант тав. Леўчанка, тройчы ранены ў баях на вышыні Безымяннай, пасля мітынга на вышыні Заазёрнай. Фота Д. І. Левантоўскага. (СФ).

ЭПІЗОДЫ ГЕРАІЧНЫХ БАЕЎ ЛЯ ВОЗЕРА ХАСАН

* * *

ДЗВЕ АТАКІ

К вечару пасля цяжкага пераходу калона танкаў прыбыла ў Зарэчча. Праведзены агляд і маскіроўка машын.

— Усё ў парадку!

— Танкі гатовы да атакі! — дакладвалі камандзіры экіпажаў. Кожнаму хацелася зараз-жа граміць ворага. Тут, калі да самураяў аставалася невялікая адлегласць, усёй істотай асабліва востра адчуваеш, як набліжаюцца мінуты бою, да якіх рыхтаваліся гадамі. Тут даеш адчот радзіме як ты падрыхтаван да самага свяшчэннага і самага галоўнага абавязку воіна Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі — умення знішчыць ворага...

На досвітку быў атрыман кароткі, лаканічны загад: «Выйсці на выходную да вышыні «Кулямётная» З мінуту экіпажы стаялі моўчкі і нерухома, як сям'я перад ад'ездам у далёкі шлях Старшы лейтэнант таварыш Нікіцін праніклівым позіркам азірнуў выстраіўшыхся і падаў каманду: «Заводзі!».

Зялёныя кусты на спінах танкаў задрыжэлі і заварушыліся, як ад лёгкага ветру. Прыняўшы баявы парадак, падраздзяленне тав Нікіціна на поўным хаду ўдалялася да агнявых пунктаў ворага.

Танкістам выпала цяжкая, але ганаровая задача. Ужо само слова «Кулямётная» гаварыла аб многім. На невялікай вышыні самураі ўстанавілі дзесяткі кулямётаў, перагароджваючы падыход нашым стралкам да сопкі Заазёрная За гэта нашы чырвонаармейцы і назвалі вышыню «Кулямётная».

Грозная лавіна жалеза і сталі без выстралаў набліжалася да стана ворага. Вось у нейкім іступленні застрачылі «гочкісы», з'явіліся першыя артылерыйскія разрывы, пасылаемыя з маньчжурскіх «дотаў».

Вецер то даносіў, то ўдаляў магутны грукат матораў Вежы сухаземных броненосцаў павольна паварачвалі жэрлы гармат на агнявыя пункты самураяў. З'явіўся яркі сноп агню Прыцэл упэўнены і дакладны! Разам з самурайскімі шапкамі ў паветра ўзляталі часткі кулямётаў, а крыху справа ад меткіх снарадаў, пасылаемых з танка тав Коніка ляцелі ўверх і калёсы процітанкавых гармат.

Грыгорый Конік, вопытны танкіст, «караўліў» замаскіраваныя гарматы самураяў Яго танк то паяўляўся справа то хутка пераходзіў на левы фланг падганяемы камандай лейтэнанта Падчэімава:

— Ходу Конік, ходу!

Вырваўшыся да балота, танк спусціўся ў камышы і быстрым артылерыйскім і кулямётным агнём пачаў прыкрываць праход танкаў і пяхоты. Матор увесь час працуе Калі нашы машыны браніраванай лавай вынырнулі з-за сопкі з фланга, па іх адкрылі агонь тры процітанкавыя гарматы.

— Бі прамой наводкай! — крыкнуў Конік.

Адзін за другім раздаліся тры выстралы Лейтэнант Падчэімаў беспамылкова паразіў цэль. Прытуліўшыся да шчыліны, ён бачыў толькі тое, у што меціў.

Вежавы стралок тав. Багданаў зараз быў за матарыста. Матор спраўна працаваў на малым хаду. Ён ведаў, што матор не падвядзе, і парашыў выйсці у разведку: «Калі не вярнуся, — сказаў ён камандзіру вежы, — уязджайце без мяне».

З прылягаючых вышынь японцы заўважылі небяспечны совецкі танк Агонь многіх гармат быў перанесен сюды.

— Недалёт, пералёт, справа, злева!—спакойна і хладнакроўна перадаваў Багданаў камандзіру танка аб узрывах снарадаў.

Адважны матарыст хутка разведаў размяшчэнне процітанкавых гармат. Падрабязна далажыў камандзіру.

Танк мяняе агнявую пазіцыю. Зноў адкрывае агонь.

Экіпаж храбрацоў зноў знойдзен Не здолеўшы перашкодзіць атапы танкаў, самураі парашылі сарваць сваю злобу на гэтай машыне Шквал агню быў вялікі. Навакол нёсся шторм узрываў Зямля ўздымалася ўверх, як мора ля скалістага берага. Земляны лівень падаў непарыўна, капіліся асколкі каменняў. Але дарэмна. Паразіўшы некалькі цэляў, наш экіпаж убачыў, як совецкія танкі, выканаўшы баявую задачу, вярталіся да зыходнай лініі. У гэты момант па пярэдняй броні «надакучлівага танка» ўдарыў японскі снарад. Лейтэнант Падчэімаў, які назіраў за ўрачыстым зваротам танкістаў, атрымаў аглушэнне. Аднак, падбіць танк не ўдалося. Разам з усёй баявой калонай ён вяртаўся на зборны пункт.

Першая атака прынесла японцам вялікія страты. Совецкія танкісты рыхтаваліся да паўторнай...

**

Другая атака супала з выдатнейшым святам. Працоўныя СССР адзначалі дзень дзевятай гадавіны войск ОКДВА

Другая атака, якую так доўга чакалі японцы, пераўзышла іх чаканні.

Пачалася яна магутным шквалам артылерыйскага агню. А калі сонца ўзышло ў зеніт, у бязвоблачным блакітным небе з'явіліся совецкія самалёты Спачатку іх было мала. Але набліжаючыйся грукат матораў мацнеў і мацнеў.

Вось прайшоў першы эшалон бамбардыроўшчыкаў, за ім другі, трэці... У бой уступіла зноў артылерыя. Жах самураяў быў празмерна вялікі. Кідаючы акопы і ўмацаванні, яны прабавалі схавацца ад метка накіраваных бомб Тады ўступілі ў бой знішчальнікі, яны пікіравалі да зямлі, паліваючы японцаў гарачым свінцом.

Узравулі танкі. Браніраванай лавай яны вылецелі з-за сопкі дабіваць фанабэрыстых, але няўпэўненых у сваіх сілах японскіх самураяў.

Машына, якую вёў малодшы камандзір тав. Конік, хутка рынулася да варожых кулямётаў. Вось ужо і першая лінія акопаў. Громячы пяхоту, танк адным штуршком змяў кулямёт. Сімфонія бою захапіла адважны экіпаж. Перамогшы трасіну, тав. Конік накіраваў танк па лініі дротавай загарожы аслабаняючы праход для нашай пяхоты

Наперадзе невялікі вал. На зацішанай скорасці машына мінавала вяршыню У шчыліну тав. Конік убачыў злева самурая, які поўз са звязкай гранат Выкарыстоўваючы скат перавала, вадзіцель уключыў трэцюю скорасць, танк уздрыгнуў, падскочыў уверх і не паспеў «ахотнік за танкам» выпусціць з рукі гранаты, як цяжкаважкая машына пакінула ад яго мокрае месца.

У машыне стаяў гарачы і душны грукат У вушах звінела ад гулу матора і качкі машыны. Але ніякая сіла не магла затрымаць імклівай атакі. З загарэўшайся травы беспярынна падымаліся ашалеўшыя ад страху японцы, каб больш ніколі не таптаць совецкай зямлі. Раздаваўся крык, і самураі траплялі пад гусеніцу совецкага танка.

Такой атакі японцы не забудуць ніколі...

**

Вось стаіць перад намі гераічны ўдзельнік двух танкавых атак комсамолец Грыша Конік. Ён і сам хвалюецца, успамінаючы перажытыя гадзіны. Зараз ён толькі-што закончыў чытку рамана «На Востоке». У гэтай кнізе хвалюючыя старонкі прысвечаны будучым баям на Далёкім Усходзе...

І вось ён чытае ў кнізе, што «глыбокай ноччу Масква даведалася аб здрадніцкім нападзе ворагаў». І тады з Крэмля ў Вялікі тэатр разам з членамі Палітбюро прышоў Сталін, каб быць разам з Масквой. Твар Сталіна быў строгі, ён ішоў спяшаючыся, і натоўп крычаў, клікаў: «Сталін! Сталін! Сталін!» Гэта быў кліч сілы і гонару, ён гучэў, як «наперад!». Потым Сталін гаварыў Словы яго разносіліся па ўсёй краіне, яны ўваходзілі ў пагранічны бой, змешваючыся з агнём і грукатам снарадаў. Радыёрупары даносілі яго голас да байцоў падземных умацаванняў, да лётчыкаў, танкістаў. Гэта быў голас нашай краіны, просты і ясны, бясконца чэсны, бацькаўска нетараплівы сталінскі голас.

— З імем Сталіна ў сэрцах, з імем Сталіна на вуснах, — гаворыць тав. Конік — мы ішлі ў атаку, без страху і хістанняў І ў будучых баях Сталін, вялікі і любімы правадыр, будзе натхняць нас на гераічны подвіг у імя нашай радзімы, у імя комунізма.

В. ЧЭРНЫШОЎ.

«Тревога», 29 жніўня 1938 г. № 200.

МАЦУЙЦЕ АБАРОНУ РАДЗІМЫ

(Пісьмо хетагураўкі Клавы Граншчыкавай у рэдакцыю „Звязды")

Год таму назад я пакінула Совецкую Беларусь і па закліку Валі Хетагуравай паехала на Далёкі Усход, каб жыць і працаваць у гэтым выдатным краі

Далёкі Усход я ведала толькі па расказах старыкоў. Я ведала, што раней гэта быў край ссылкі і катаргі.

За годы совецкай улады наш Далёкі Усход ператварыўся ў квітнеючы край. Радасным і шчаслівым жыццём зараз жывуць тут працоўныя.

Пасля таго, як я прыехала ў Хабараўск, мяне накіравалі ў тайгу на лесазагатоўкі Вельмі многа прышлося перанесці труднасцей. Але я не сумавала. Актыўна працавала сярод хатніх гаспадынь, прыцягнула іх да культурнага абслугоўвання рабочых, калгаснікаў, арганізавала драмгурток. Мы выязджалі ў баракі ставіць пастаноўкі. Вельмі часта мне прыходзілася ісці за 20—25 кіламетраў, каб правесці з рабочымі гутарку, даведацца, як яны працуюць, што перашкаджае ім у рабоце. Чым цяжэй было працаваць, тым больш расло імкненне — перамагчы труднасці. У тайзе мароз даходзіў да 50 градусаў, але, не гледзячы на гэта, я адчувала сябе яшчэ больш бадзёра. З гонарам выканала пастаўленую перада мною задачу.

Па звароце з тайгі я падала ў партарганізацыю заяву з просьбай прыняць мяне ў кандыдаты партыі Старэйшыя таварышы высока ацанілі маю работу, прыняўшы мяне ў кандыдаты партыі Леніна—Сталіна. Гэта яшчэ больш узбуджае ў мяне імкненне да работы, гэта натхняе мяне на выкананне ўсіх задач, пастаўленых партыяй і ленінскім комсамолам, які выгадаваў і выхаваў мяне.

З першага дня я палюбіла гэты квітнеючы край і рашыла астацца тут жыць назаўсёды.

Японскія самураі некалькі разоў прабавалі адняць у нас гэты прыгожы Далёкаўсходні край. Апошні налёт на нашу тэрыторыю з боку японцаў даў ім, як і раней, адчуць на сваіх спінах усю магутнасць і непераможнасць нашага Далёкаўсходняга Чырвонасцяжнага фронта.

Ніколі і нікому не аднімуць у нас шчаслівага жыцця. Разам з працоўнымі Далёкага Усходу на абарону нашых свяшчэнных граніц стане ўвесь совецкі народ.

Я звярачаюся з заклікам да калгаснікаў калгаса «Кастрычнік», Прапойскага раёна і да ўсіх комсамольцаў Совецкай Беларусі, каб яны нястомна авалодвалі ваеннай справай. Хай яны следуюць прыкладу нашых далёкаўсходнікаў і ператвораць кожны калгас, завод, цэх у непрыступную крэпасць абароны Гэта будзе адным з лепшых падарункаў нашай маці-радзіме да дня 20-годдзя ленінска-сталінскага комсамола.

КЛАВА ГРАНШЧЫКАВА.
г. Благавешчанск.

ВОПЫТ ІЛЬНАВОДА СІМАНАВА

Зімой 1938 г. Ошэр Евелевіч Сіманаў — лепшы стаханавец калгаса «Чырвоны Сормавец», Чэрыкаўскага раёна—паставіў перад сабой задачу дабіцца ўраджаю ільну са ўсёй плошчы ў 19 гектараў па 7 цэнтнераў, а з рэкорднага ўчастка ў адзін гектар — 15 цэнтнераў. З гэтага вопытнага ўчастка Сіманаў рашыў зняць два ўраджаі за адно лета.

Смелы пачын стаханаўца-вопытніка знайшоў усямернае падтрыманне з боку партыйнай арганізацыі раёна. Сіманаў быў акружан увагай і штодзённай дапамогай. Зараз мы можам сказаць, што ўзятыя на сябе абавязацельствы тав. Сіманаў, разам з калгаснікамі-стаханаўцамі, поўнасцю выканаў.

Яшчэ ранняй вясной глеба пад лён была добра апрацавана. Перад сяўбой на вопытны ўчастак было ўнесена 0,5 тоны попелу, 4 цэнтнеры суперфасфату. Лён быў пасеян 22 красавіка. У далейшым на гэтым участку праводзілася перыядычная падкормка пасеваў, была праведзена трохразовая прапалка. У выніку добрага догляду лён вырас густы і высокі. 5 ліпеня правялі церабленне. Пасля канчатковай апрацоўкі з рэкорднага ўчастка атрымана 12 цэнтнераў добраякаснага валакна з гектара.

6 ліпеня гэты ўчастак быў узоран, пракультываваны і 10 ліпеня зноў на ім пасеян лён. Не гледзячы на неспрыяльныя кліматычныя ўмовы, пасеяны ў другі раз лён добра вырас і ў ім выспела насенне.

Паводле папярэдняй ацэнкі спецыялістаў, лён другога ўраджаю з вопытнага гектара дасць не менш 4,5—5 цэнтнераў валакна.

Многа клапатлівай працы ўкладзена тав. Сіманавым і стаханаўцамі-калгаснікамі на ўсім калгасным пасеве ільну. Тут таксама праводзілася падкормка і 2—3-разовая прапалка ільну. Усё гэта забяспечыла высокую ўраджайнасць ільну з усяго масіва, які дасць не менш 7 цэнтнераў валакна з гектара.

Сваім выдатным вопытам тав. Сіманаў паказаў калгаснікам раёна, як трэба змагацца за выкананне рашэнняў партыі і ўрада і ўказанняў таварыша Сталіна аб павышэнні ўраджайнасці тэхнічных культур. Зараз калгас «Чырвоны Сормавец» першым па раёну прыступіў да апрацоўкі і здачы ільнапрадукцыі дзяржаве. Ужо здадзена 1 тона ільнавалакна.

І. ВЕТРАЎ.
сакратар Чэрыкаўскага РК КП(б)Б.

ПАКЛЁПНІК ПАД МАСКАЙ СЕЛЬКОРА

Грамадзянін М. І. Юдзянкоў з калгаса «Трактар», Чырвонапольскага раёна, нямала напісаў пісем і заяў аб старшыні гэтага калгаса тав. Герашчанка. Адно з такіх пісем, у якім тав. Герашчанка абвінавачваўся ў разбазарванні калгаснай маемасці, у праследванні аўтара пісьма за крытыку і іншых злачынствах, было прыслана ў рэдакцыю «Звязды». Пры расследванні матэрыяла на месцы выявіўся малюнак зусім не той, які апісваў Юдзянкоў.

Калгас «Трактар» з'яўляецца адным з перадавых калгасаў Чырвонапольскага раёна. Многімі поспехамі калгас абавязан свайму старшыні. Тав. Герашчанка — сапраўдны любімец калгаснікаў, добры арганізатар і гаспадарнік. Характэрна, што калі ворагі народа, якія сядзелі ў кіраўніцтве раёнам, знялі тав. Герашчанка з работы, то праз некалькі тыдняў калгаснікі самі патрабавалі яго назад і на агульным сходзе выбралі старшынёй калгаса.

Пры расследванні выявіўся сапраўдны твар М. І. Юдзянкова. Юдзянкоў — сын жандарма. Ён увесь час займаецца падрыўной работай у калгасе. Не гледзячы на тое, што яму 27 год і жонцы 25, яны ўдваіх за гэты год маюць толькі 87 працадзён, у той час, калі любы калгаснік гэтага калгаса мае не менш 300 працадзён. Юдзянкоў сістэматычна парушае правілы калгаснага агульнажыцця. Заўважаліся факты, калі ён самавольна браў калгаснага каня, ехаў у калгасны лес, рубіў дровы і адвозіў іх прадаваць у м. Чырвонаполле. За безгаспадарчыя адносіны да конскага пагалоўя праўленнем калгаса Юдзянкову вынесена вымова.

Ведучы фактычна ў калгасе падрыўную работу, Юдзянкоў рашыў прыкрыцца маскай селькора. Але гэтая спроба не ўдалася. У радах селькораў, якія справай і пяром дапамагаюць ажыццяўляць мерапрыемствы партыі і ўрада, не месца такім, як Юдзянкоў.

П. САЎЧУК.

АСВОЙВАЮЦЬ БАЛОТЫ

ЧАВУСЫ. Калгасы раёна шырока разгарнулі асушку балот і залужэнне сенажацяў. Ужо асушана больш 100 гектараў балота, пракапана 17,5 кіламетра канаў спецыяльным канавакапацелем, праведзена залужэнне 41 гектара сенажаці. Апрача гэтага падрыхтавана для залужэння 300 гектараў малапрадукцыйных лугоў.

На раней асушаных участках чакаецца багаты ўраджай. Калгас «Комунар» Валковіцкага сельсовета мяркуе сабраць не менш, як 400 цэнтнераў буракоў, 350 цэнтнераў капусты і 7 цэнтнераў валакна-пянькі з кожнага гектара асушанага балота.

На жаль, кіраўнікі раёна і Чавуская МТС (дырэктар тав. Палякоў) слаба дапамагаюць калгасам разгортваць меліярацыйныя работы. Дырэктар МТС перакінуў на іншыя работы трактар, які працаваў з канавакапацелем. Гэтым ён спыніў копку канаў на балотах.

А. КАРНІЕНКА.

Кіностудыя «Ленфільм» выпускае да Кастрычніцкай гадавіны новы гістарычны рэвалюцыйны фільм «Человек с ружьем». Ставіць карціну заслужаны дзеяч мастацтваў С. Юшкевіч па сцэнарыю Н. Пагодзіна. НА ЗДЫМКУ: кадр з фільма. В. І. Ленін (заслужаны артыст М. Штраух) і Шадрын (артыст Б. Тенін).

(СФ).

РОСТ ЗБЕРАЖЭННЯЎ КАЛГАСНІКАЎ

У сувязі з багатым ураджаем і ростам заможнасці і культурнасці калгаснікаў у сельскіх ашчадных касах БССР адзначаецца прылiў укладаў.

За гэты год па сельскіх ашчадкасах паступіла 3.152 тыс. рублёў. Астатак зберажэнняў на 21 верасня бягучага года склаў 11.552 тыс. руб. — на 57 проц. больш у параўнанні з гэтым-жа перыядам мінулага года. Прыцягнуты тысячы новых укладчыкаў-калгаснікаў.

Асаблівых значных поспехаў дабілася Барсукоўская сельская ашчадкаса Аршанскага раёна, датэрмінова выканаўшая план прыцягнення ўкладаў у III квартале на 325 проц. Работнікі гэтай касы праводзяць сярод калгаснікаў, сезонных рабочых і іх жонак гутаркі аб значэнні ашчаднай справы, аб выгаднасці захавання грошай у дзяржаўных ашчадкасах. Астроўская ашчадкаса Бешанковіцкага раёна за 7 месяцаў прыцягнула 22.000 рублёў новых укладаў.

Для лепшага абслугоўвання сельскага насельніцтва ў раёнах рэспублікі закончана арганізацыя 100 новых ашчадных кас.

БУДАЎНІЦТВА НОВАГА ТЭАТРА У МАГІЛЕВЕ

Магілёўскі гарадскі совет адвёў зямельны ўчастак паміж Першамайскай і Ленінскай вуліцамі для пабудовы новага будынка драматычнага тэатра на 1 200 месц. Сцэна па свайму абсталяванню зможа абслугоўваць і оперныя пастаноўкі. Будаўніцтва тэатра пачнецца ў 1939 годзе і павінна быць закончана ў 1940 г. Аб'ём будынка вызначан у 60 тыс. куб. метраў, кошт яго — 6 мільёнаў рублёў.

Заключан дагавор з праектнай канторай Усесаюзнага камітэта па справах мастацтваў на распрацоўку праекта. Да гэтай работы прыцягваюцца і архітэктары БССР.

ПЕРАМОЖЦА УСЕСАЮЗНЫХ СПАБОРНІЦТВАЎ

ГОМЕЛЬ 30 верасня футбольная каманда дрэваапрацоўчага камбіната імя Ежова правяла фінальны матч на першынства ЦК саюза лесапілення і дрэваапрацоўкі з камандай камбіната «Заходняя Дзвіна» Калінінскай вобласці. Матч закончыўся перамогай гомельскай каманды з лікам 4:1.

Перамогай у гэтым матчы каманда камбіната імя Ежова заваявала ўсесаюзнае першынства па футболу саюза рабочых лесапілення і дрэваапрацоўкі. Каманда ўзнагароджана пераходным кубкам ЦК саюза і каштоўнымі падарункамі.

Па гарадах і раёнах рэспублікі

◆ Калгасніца калгаса Сталбуны, Свяцілавіцкага раёна, Ульяна Феськова нарадзіла трайню — трох хлапчукоў. Дзеці здаровыя. Маці адчувае сябе добра. Тав. Феськова атрымала прывітальную тэлеграму ад наркома аховы здароўя БССР тав. Новікава. Адначасова нарком выслаў ёй падарунак — камплекты для дзяцей і грошы. Свяцілавіцкім райздравам трайня ўзята пад медыцынскі нагляд.

(«Палеская праўда»).

◆ Машыніст Зарубскай машынна-трактарнай станцыі (Дубровенскі раён) тав. Гузаў на малатарні МК-1100, у калгасе «Перамога», Баеўскага сельсовета, за адзін дзень намалаціў 11 цэнтнераў насеннай канюшыны пры норме 4 цэнтнеры. За адзін гэты дзень тав. Гузаў зарабіў 209 рублёў.

(«За соцыялістычнае будаўніцтва»).

ВЫСТУПЛЕННЕ СЫРОВЫ

ПРАГА, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). Учора ў 22 гадзіны па сярэднееўрапейскаму часу прэм'ер-міністр генерал Сыровы выступіў па радыё са зваротам да народа і арміі.

«Грамадзяне і салдаты,—заявіў ён,— як салдат і старшыня ўрада, я павінен у першую чаргу думаць аб жыцці вас усіх — мільёнаў працоўных сграмадзян — мужчын, жанчын і дзяцей. Я перажываю найцяжэйшы момант у сваім жыцці і з болем выконваю абавязак, цяжасць якога роўнасільна смерці. Павінен вам сказаць шчыра, як мне падказваюць веды адказнага армейскага кіраўніка, што супроць нас стаіць сіла, пераўзыходзячая нашу, і пад націскам гэтай сілы мы вымушаны былі выносіць нашы рашэнні».

«У Мюнхене, — прадаўжаў Сыровы, — сайшліся главы ўрадаў чатырох дзяржаў і пастанавілі прапанаваць нам прыняць новыя граніцы, якія выключаюць Судэта-Нямецкую вобласць, далучаемую да Германіі. Нам быў прадастаўлен выбар паміж адчаянай і безнадзейнай абаронай, якая каштавала-б жыцця ўсяму даросламу пакаленню мужчын, дзецям і жанчынам, і прыняццём умоў, якія па сваёй жорсткасці не маюць прыкладу ў гісторыі. Нашы суседзі стаяць у поўным узбраенні. Мы прадстаўляем краіну, у літаральным сэнсе асаджаную з усіх бакоў сілай, у многа разоў пераўзыходзячай нашу. Глыбока ўзрушаныя, мы, усе вашы кіраўнікі, разам з арміяй і прэзідэнтам рэспублікі ўзважылі ўсе магчымасці, якія нам асталіся. У выбары паміж змяншэннем тэрыторыі рэспублікі і смерцю народа, мы палічылі за лепшае захаванне жыцця людзей. Мы выканаем умовы, якія нам былі навязаны сілай. Мы заклікаем увесь народ, усіх грамадзян, каб яны перамаглі свой смутак, расчараванне і боль і дапамаглі забяспечыць нашу будучыню ў нашых новых граніцах».

«Наша армія ў будучым, — заявіў у заключэнне Сыровы, — будзе мець сваёй задачай ахоўваць народ і дзяржаву, стаяць на варце, як да гэтага часу. Будзем старацца цяпер усе, каб наша дзяржава ў новых граніцах была моцнай і каб вам, грамадзянам, было забяспечана новае жыццё, спакой і благатворная праца. З вашай дапамогай нам гэтага ўдасца дасягнуць».

ПАСЯДЖЭННЕ ФРАНЦУЗСКАГА ЎРАДА

ПАРЫЖ, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). 30 верасня вечарам пад старшынствам прэзідэнта рэспублікі Лебрэна адбылося пасяджэнне французскага ўрада. Глава ўрада Даладз'е інфармаваў кабінет аб пагадненні, дасягнутым на мюнхенскай канферэнцыі.

Як перадае агенцтва Гавас, французскі ўрад аднагалосна адобрыў пазіцыю Даладз'е на мюнхенскай канферэнцыі.

Урад рашыў склікаць на 4 кастрычніка пасяджэнне парламента.

4 кастрычніка, у 9 гадзін 30 мінут, адбудзецца нарада ўрада і ў 11 гадзін—пасяджэнне ўрада пад старшынствам прэзідэнта рэспублікі.

Паводле вестак агенцтва, на склікаемым 4 кастрычніка надзвычайным пасяджэнні парламента ўрад далажыць аб «важных падзеях, якія знайшлі сваё завяршэнне ў рашэннях мюнхенскай канферэнцыі».

У ЛІГЕ НАЦЫЙ

ЖЭНЕВА, 30 верасня. (БЕЛТА). У шостай (палітычнай) камісіі Лігі нацый абмяркоўваўся на працягу двух апошніх дзён прадстаўлены іспанскай дэлегацыяй праект рэзалюцыі аб неадкладнай эвакуацыі ўсіх замежных байцоў з радоў рэспубліканскай арміі і аб назначэнні міжнароднай камісіі па назіранню за гэтай эвакуацыяй.

У сувязі з велізарным маральным значэннем такога рашэння скрытыя і адкрытыя ворагі рэспубліканскай Іспаніі ўсяляк прабавалі «перакачаць» іспанскую дэлегацыю не ставіць сваю рэзалюцыю на парадак дня пленума. Калі-ж усе іх намаганні аказаліся марнымі, і пытанне ўсё-такі было пастаўлена, яны правялі адкрытую атаку супроць іспанскай прапановы, патрабуючы перадачы яе ў лонданскі камітэт па неўмяшанню.

У падтрыманне іспанскай дэлегацыі выступілі тав. Літвінаў і прадстаўнікі Мексікі і Калумбіі.

Па сканчэнні спрэчак была прынята па прапанове старшыні камісіі і са згоды іспанскай дэлегацыі рэзалюцыя, якая прапануе, каб Совет Лігі ўключыў прадстаўленую іспанскай дэлегацыяй рэзалюцыю ў свой парадак дня. Па статуту Лігі пажаданні пленума не патрабуюць аднагалосся і могуць быць прыняты таму простай большасцю галасоў.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

На шасе Жуйчан—Унін (на паўднёвы захад ад Цзюцзяна) за апошнія дні кітайцы нанеслі сур'ёзныя паражэнні японцам. 123 японскі полк у баях з кітайцамі страціў да 2 тысяч забітымі і раненымі. Прыбыўшае падмацаванне страціла забітымі і раненымі каля 1200 чалавек. У іншых раёнах гэтай лініі фронта японскія страты вылічаюцца ў 1500 чалавек.

У гэтым раёне адбіты ўсе японскія спробы захваціць Унін з мэтай далейшага наступлення ўздоўж шасе ад Уніна на Сяньнін (буйны пункт на Кантон-Ханькоўскай чыгунцы).

На лініі Цзюцзян—Няньчан на правым флангу японскіх войск іх страты дасягаюць тысячы чалавек. Сярод забітых 4 афіцэры.

Вык. абавязкі адказнага рэдактара Д. Т. ЛЕБЕДЗЕЎ

ПРЫПРАВЫ

Смак стравы абумоўліваецца наяўнасцю ў ёй смакавых рэчываў, іх якасцю і колькасцю. Гэтыя рэчывы двайкага роду: асноўныя, якія змяшчаюцца ў харчовых прадуктах, і дабавачныя, якія змяшчаюцца ў смакавых прыправах.

Прамое прызначэнне прыпраў— папаўняць недастатковую эфектыўнасць харчовых прадуктаў.

Да ліку такіх прыпраў, якія паляпшаюць смак стравы, надаюць ёй апетытны выгляд і арамат, адносіцца таматны кетчуп. Гэта універсальны соус, які аднолькава добры да мясных, мучных і рыбных блюдаў. Некалькі лыжак кетчупа дастаткова для таго, каб зрабіць страву прывабней на выгляд і смачней. Кетчуп — неабходная састаўная частка для падрыхтавання розных салатаў. Мы прыводзім рэцэпт аднаго з такіх салатаў — салата з памідор і зялёнага гарошка (замест кансерціраваных памідораў можна браць і свежыя):

Салат памідораў і зялёнага гарошка

На 4 порцыі.

Кансервы «Памідоры цэльныя»	100 г (1/5 банкі)
Кансервы «Зялёны гарошак»	105 г (1/4 банкі)
Кансервы «Кетчуп»	60 г
Бульба вараная	200 г
Смятана	150 г
Яйкі	2 шт.

Памідоры наразаюць долькамі, вараную бульбу—тонкімі ломцікамі, змешваюць іх з зялёным гарошкам, запраўляюць смятанай з дабаўленнем працёртага жаўтка і кетчупа.

Прыгатаваныя прадукты ўкладваюць у салатнік горкай і ўпрыгожваюць долькамі памідораў, зялёным гарошкам, бялком яйка і зеленню пятрушкі.

ГЛАЎКАНСЕРВ.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
17 КАСТРЫЧНІКА 1938 г.
адкрыццё сезона
ў памяшканні Бел. Дзярж. яўрэйскага тэатра
Рэпертуар
НОВЫЯ ПАСТАНОЎКІ
Рымскі-Корсакаў ЦАРСКАЯ НЯВЕСТА
Чайкоўскі ЛЕБЯДЗІНАЕ ВОЗЕРА
Даргамыжскі РУСАЛКА
Пучыні ЧЫО-ЧЫО-САН
Узноўленыя пастаноўкі
Дзержынскі ЦІХІ ДОН
Пучыні ТОСКА
Вердзі РЫГАЛЕТО
Гертэля МАРНАЯ ПЕРАСЦЯРОГА (Тщетная предосторожность)
ПРЫМАЮЦЦА ЗАЯЎКІ ў касе тэатра на пастаянныя месцы і калектыўныя паходы з 12 да 2 г. і з 5 да 8 г. веч.

Гастролі Віцебскага Белдзяржтэатра (памяшк. Белдзярж. драмтэатра)
2 кастрычніка
ЛЮБОЎ ЯРАВАЯ
Пачатак у 8 г. веч.
Каса з 12 да 2 і з 5 да 8 г. веч.

Кінотэатр «Чырвоная зорка»
ПРАФЕСАР МАМЛОК

Кінотэатр «Інтэрнацыянал»
АГНІ ВЯЛІКАГА ГОРАДА

Кінотэатр «Спартак»
АЭРАГРАД

Дзіцячы кінотэатр
1. Выпадак на граніцы
2. Ля паўднёвых граніц
3. Піонерыя № 7.
4. Насарог.

Кінотэатр «Навіны дня»
1. Журнал Саюзкінохронікі № 42.
2. Сталінскія клопаты.
3. Насарог.

Кінотэатр «Парыжская Комуна» (ЦПКА)
ПРАФЕСАР МАМЛОК

ВІЦЕБСКІ БЕЛДЗЯРЖТЭАТР КУПЛЯЕ СТАРЫННЫЯ РЭЧЫ:
ГАДЗІННІКІ КАМІННЫЯ ВЯЛІКІЯ, ХРУСТАЛЬНЫЯ ЛЮСТРЫ, ПІСЬМОВЫЯ ПРЫБОРЫ, ХРУСТАЛЬНЫЯ ГРАФІНЫ З РУМКАМІ, КАРАЛІ і т. д. для п'ес.
Звяртацца: вул. ЭНГЕЛЬСА, БЕЛАРУСКІ ТЭАТР, тэл. 24-905 і 21-810 з 10 да 2 гадзін дня.

МЯНЯЮ КВ. У МАГІЛЕВЕ на КВ. у МЕНСКУ. Даведацца: ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЯ, 20, кв. 5.

Беларускі інстытут удасканалення ўрачоў
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ЎРАЧОЎ І ГОРРАЙЗДРАВАЎ
аб арганізацыі наступных курсаў удасканалення:
КУРСЫ ПА ЗУБНЫХ ХВАРОБАХ тэрмінам на тры месяцы з 15 КАСТРЫЧНІКА г. г. у г. МЕНСКУ.
КУРСЫ ПА ПЕДЫЯТРЫІ (без адрыву ад вытворчасці) тэрмінам на 6 месяцаў з 15 КАСТРЫЧНІКА г. г. у г. МЕНСКУ.
КУРСЫ ПА ВУХУ, ГОРЛУ І НОСУ тэрмінам на 3 месяцы з 20 КАСТРЫЧНІКА г. г. у г. ВІЦЕБСКУ.
УРАЧЫ ЗАБЯСПЕЧВАЮЦЦА ІНТЭРНАТАМ І СТЫПЕНДЫЯЙ (за выключэннем курсаў па педыятрыі), а таксама за імі поўнасцю захоўваецца заработная плата па месцу работы.
ЗАЯВЫ ЎРАЧОЎ са згодай горрайздраваў павінны паступаць у інстытут — г. МЕНСК, СОВЕЦКАЯ, 38 да 5 КАСТРЫЧНІКА г. г.

ХИМИКО-ФАРМАЦЕВТИЧЕСКАЯ ФАБРИКА ГАЛЕН МОСКВА
ПАТРАБУЙЦЕ ВА ЎСІХ АПТЭКАХ І МАГАЗІНАХ САНІТАРЫІ І ГІГІЕНЫ ПРОМТАВАРАЎ
ИОД-ГИПЕРСОЛ
па праф. С. Ф. МАЙКАВУ
Дазв. вучон. мед. советам НКАЗ СССР
ЙОД-ГІПЕРСОЛ пераважна назначаецца артэрыясклеротыкам, якія хварэюць сіфілісам, залатухай, паражэннем лімфатычных жалёз, пры хранічным рэўматызме, падагры, пры гіпертаніі, для рассасвання хранічных інфільтратаў і эксудатаў, пры ртутным і свінцовым атручваннях.
БОМ-БЕНГЬЕ
(метола-саліцылавы бальзам). Дазв. вучон. мед. советам НКАЗ. Лёгка ўсваямы скурай, болеўціхаючы сродак пры вострым і хранічным рэўматызме, падагры, мігрэні і т. д.
АЛЛИЛСАТ
Карэлізаваная часночная выцяжка, дазв. НКАЗ. Рэкамендуецца ўрачамі пры агульным артэрыясклерозе з гіпертаніяй і без гіпертаніі, пры атаніі кішэчніка, калітах са схільнасцю да запораў, пры з'явах сардэчнай астмы.
ВАГИЛЕН
Процівазачатачныя шарыкі. Адобрана камісіяй НКАЗ па барацьбе з абортамі.
КАЛЬЦЕКС
новы лячэбны папярэджваючы сродак супроць грыпа, адобр. клінікай, дазволена НКАЗ.
ОФТАЛЬМОЛЬ-КУПРУМ
Дазв. НКАЗ
Гемагезіраваная вочная мазь для лячэння захворванняў кан'юнктывы, трахомы, фалікулярнага катара і інш. хвароб слізістай абалонкі вачэй.
АСТМАТОЛ
курыцельны сродак супроць астмы і ўдушлівага кашля. Дзейнічае на дыхацельны цэнтр, аблягчае дыханне і ўстараняе спазмы бранхіяльных мышц.
ПРИ ОТСУТСТВИИ НА МЕСТАХ СООБЩАЙТЕ: МОСКВА, ЧУДОВ ПЕР. 8, СОЮЗХИМФАРМТОРГ

ДА ЎВАГІ
УСІХ ШКОЛЬНЫХ, ВУЧЭБНЫХ, АГУЛЬНА-АДУКАЦЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, РАБОЧЫХ І КАЛГАСНЫХ КЛУБАЎ, ХАТ-ЧЫТАЛЬНЯЎ, ЧЫРВОНЫХ КУТКОЎ, СОЎГАСНЫХ І КАЛГАСНЫХ КІНОТЭАТРАЎ, САНАТОРЫЙ, ДАМОЎ АДПАЧЫНКУ, БОЛЬНІЦ, ДОМАКІРАЎНІЦТВАЎ.
БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ „САЮЗКІНОПРАКАТ“
ДЛЯ УКЛЮЧЭННЯ У ПЛАН СНАБЖЭННЯ 1939 ГОДА МАСТАЦКІМІ І ВУЧЭБНА-ШКОЛЬНЫМІ КІНОФІЛЬМАМІ
праводзіць да 10 кастрычніка 1938 г.
рэгістрацыю ўсёй вузкаплёначнай кіноапаратуры
Незарэгістраваныя ўстаноўкі да ўказанага тэрміну не будуць уключаны ў план снабжэння вузкаплёначнымі кінофільмамі.
РЭГІСТРАЦЫЮ ПРАВОДЗЯЦЬ: БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ, ВІЦЕБСКАЕ, ГОМЕЛЬСКАЕ, АРШАНСКАЕ І БАБРУЙСКАЕ АГЕНЦТВЫ «САЮЗКІНОПРАКАТ».

ЛИПОЦЕРЕБРИН
ПРЕПАРАТ ЛИПОИДОВ МОЗГА
ПОКАЗАН ПРИ ЗАБОЛЕВАНИЯХ ЦЕНТРАЛЬНОЙ НЕРВНОЙ СИСТЕМЫ-НЕРВИЗМ и ФИЗИЧЕСКОМ ПЕРЕУТОМЛЕНИИ НЕВРАСТЕНИИ ТУБЕРКУЛЕЗЕ и ДРУГИХ ЗАБОЛЕВАНИЯХ
ЛИПОЦЕРЕБРИН ВЫПУСКАЕТСЯ В ТАБЛЕТКАХ и АМПУЛАХ
ФАБРИКА ЭНДОКРИННЫХ ПРЕПАРАТОВ ВОХИМФАРМА НКЗдрава СССР

ТРЕБУЙТЕ ВО ВСЕХ АПТЕКАХ И МАГАЗИНАХ САНГИГИЕНЫ

Выдавецтву «Звязда» патрэбны КАЧАГАРЫ І ІСТАПНІКІ.
Звярацца: Совецкая, 49, другі паверх, пакой № 1.

БЕЛАРУСКАЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАНТОРА
„САЮЗУЦІЛЬ“
Менск, вул. Дзем'яна Беднага, 8, тэл. 22-185, 22-18.
ПРАВОДЗІЦЬ ЗАГАТОЎКУ УЦІЛЬЖЫВСЫРАВІНЫ:
ТРАП'Е, СТАРУЮ ПАПЕРУ, СТАРЫ ГУМАВЫ АБУТАК, КОСЦЬ, КАЛЯРОВЫ МЕТАЛ, ПАКЛЮ, СТАРЫЯ КАНСЕРВАВЫЯ БАНКІ, ПРОМАДЫХОДЫ, ШЧАЦІНУ КОНСКІ ВОЛАС, ПУХ-ПЯРО, РОГСЫРАВІНУ, ФРУКТОВЫЯ КОСТАЧКІ І ІНШ. ВІДЫ.
ЗАГАТОЎКА вядзецца праз зборшчыкаў, фургоншчыкаў, агентаў і ларкі як у гарадах, так і на вёсцы.
ПРЫ ЗДАЧЫ ЎЦІЛЬЖЫВСЫРАВІНЫ ПАТРАБУЙЦЕ ПРЭЙСКУРАНТ ЦЭН, зацверджаных Наркомлегпромам СССР.
ЗАХОЎВАЙЦЕ ВАШ ХАТНІ УЦІЛЬ І ПРАДАВАЙЦЕ ЯГО САЮЗУЦІЛЮ.
ВА ЎСІХ ГАРАДАХ І РАЁННЫХ ЦЭНТРАХ «САЮЗУЦІЛЬ» МАЕ СВАЕ ЗАГАТОЎЧЫЯ КАНТОРЫ.
Паведамляйце Ваш адрас канторам, і да Вас прыедуць за уцілем.
БЕЛАРУСКАЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАНТОРА «САЮЗУЦІЛЬ».

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 49. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-352; намесніка рэдактара — 25-188; сакратарыята — 20-830; АДДЗЕЛАЎ: партыйнага — 21-353; совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412; прамысловага — 21-356; сельскагаспадарчага — 21-846; літаратуры, мастацтва, навукі і асветы 23-955; міжнароднай і замежнай інфармацыі — 25-189; аддзел пісем 20-844, 21-399, 21-885; ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры — 21-550; заг. выдавецтва — 21-358; аб'яў — 25-384.